ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГОД ВЫДАННЯ 31-ы | № 4 (1745) | Пятніца, 11 студзеня 1963 года | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

НАТАТКІ ПРА МАСТАЦКУЮ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ АБ НАДЗЁННЫХ ПРАБЛЕМАХ ЛІТАРАТУРЫ

ПРЫГАЖОСЦЬ У ШКЛЕ

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

БІБЛІЯТЭКА ВЫДАТНАЙ РАБОТЫ

Студэнты III курса акцёрскага факультэта Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута В. Басаў, А. Луцэвіч, А. Чарноцкі паказваюць фрагмент з кампазіцыі «Кастрычнік, 1917». Здымак быў зроблены ў час рэпетыцыі студэнтаў разам з кіраўніком курса А. Бутаковым (другі злева).

Фота Ул. КРУКА.

ПРА ДЭКАДУ — ПАСЛЯ ДЭКАДЫ

ДЗЕНЬ ПЯТЫ, ЗНАМЯНАЛЬНЫ

Ніл ГІЛЕВІЧ

Як чалавеку, які цікавіцца народнай творчасцю і любіць мастацкую самадзейнасць, які з вялікай нецярплівасцю чакаў, а потым з няменшай увагай сачыў за ходам Дэкады, мне хацелася б выказаць некаторыя свае думкі і меркаванні аб стане самадзейнага мастацтва ў нашай рэспубліцы, падзяліцца сваімі ўражаннямі аб тым, што давялося пачуць і ўбачыць на канцэртах 2-й Усебеларускай, што мяне ўзрадавала і ўсцешыла, а што расчаравала і нават моцна засмуціла. Падкрэсліваю — гэта будуць мае **асабістыя** ўражанні і меркаванні, можа быць, некаторыя з іх і спрэчныя ці памылковыя, але яны выцякаюць з маіх перакананняў і здаюцца мне прынцыпова важнымі.

Я хачу закрануць, па сутнасці, толькі адно пытанне: гэта — рэпертуар самадзейнасці і звязаны з ім адбор выканаўцаў. Іменна гэта выклікала ў маёй душы найбольшую трывогу і прымусіла ўзяцца за пяро.

У канцэртнай праграме кожнай вобласці і горада Мінска было нямала цікавых нумароў, якія пасапраўднаму ўсхвалявалі гледача і глыбока чалавечым зместам, і дасканаласцю мастацкай формы, і высокім майстэрствам выканання. Не ведаю, ці ёсць патрэба пералічваць гэтыя лепшыя нумары — значная частка іх трапіла ў заключны канцэрт і яны ўсім вядомыя. Назаву толькі тое, што надзвычай спадабалася мне асабіста: у мінчан — «Красная Прэсня» Мурадэлі ў выкананні харавой капэлы Дома культуры трактарнага завода (кіраўнік В. Раговіч) і «Сведка» Багушэвіча ў выкананні інжынера аўтазавода І. Гарэцкага; з Брэсцкай вобласці — выступленне балалаечніка А. Крэза, венгерскі танец «Вігада» ў выкананні Брэсцкага гарадскога маладзёжнага ансамбля танца і «Бухенвальдскі набат» Мурадэлі; з Віцебскай вобласці — «Лявоніха» ў выкананні народнага ансамбля танца Віцебскага РДК і выступленне цымбальнага аркестра Палаца культуры мясцовай прамысловасці г. Віцебска; з Гомельскай — Народны хор Тураўскага Дома культуры (кіраўнік М. Бяспалаў), хор Мазырскага гарадскога Дома культуры (кіраўнік І. Казелька), «Украінская пляска» і балгарская народная песня «Цяжкі шлях у гарах» (народны ансамбль песні і танца Палаца культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна); з Мінскай — выступленне сям'і Тарговічаў (Мядзельскі раён), хоры вёсак Морач (кіраўнік Е. Абабурка) і Лявонавічы (кіраўнік П. Касач), і «Дзявочы карагод» у выкананні ансамбля дудароў Капыля, і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці вёскі Цімкавічы; з Магілёўскай вобласці — выступленне гусляра П. Панькова, жаночы вакальны ансамбль Баркалабаўскага сельскага клуба, аркестр цымбалістаў Асіповіцкага раёна і хор даярак калгаса імя Пушкіна Бабруйскага раёна.

Гродзенскую вобласць я прамінуў знарок. Справа ў тым, што з яе канцэртнай праграмы мне куды лягчэй пералічыць тое, што не спадабалася, чым тое, што спадабалася. Уласна кажучы, гэта я і зраблю, перш чым перайсці да галоўнай размовы. На маю думку, няўдалымі нумарамі ў гродзенцаў былі (перш за ўсё па прычыне слабасці саміх твораў, а не выканання) «Песня аб Мінску» Зубцова, «Калыханка» Петрашэвіча; не варта было, бадай, уключаць у праграму і верш Асеева «Раззбраенне» — гэта далёка не лепшы твор вядомага паэта.

Але некалькі не зусім удалых нумароў не псуюць таго выдатнага агульнага ўражання, якое засталося ад канцэрта мастацкай самадзейнасці Гродзеншчыны.

Гродзенская вобласць выступала на пяты дзень Дэкады. Гэты пяты дзень і ўспамінаю я перш за ўсё, калі заходзіць размова пра Дэкаду.

І я думаю: дзе ж прычыны поспеху гродзенцаў? Што гэтак выгадна вылучыла іх з усіх астатніх абласцей? Што прынесла ім славу?

А прычын гэтых шукаць не трэба — яны зусім відавочныя. Ва ўсякім разе, для мяне яны ясныя, як божы дзень. Канцэртная праграма Гродзеншчыны вызначылася трыма найбольш важнымі якасцямі, якіх вельмі не хапала ў праграмах іншых абласцей.

Што ж гэта за тры якасці?

Па-першае, гродзенцы прывезлі на Дэкаду сапраўднае **мастацтва**, а не падробкі пад яго. Паглядзіце, з якім густам падабраны ў іх нумары, якія выдатныя творы — і музычныя, і харэаграфічныя, і літаратурныя — уключаны ў праграму, творы, што ўжо самі па сабе, незалежна ад выканання, нясуць вялізнае ідэйна-эстэтычнае і эмацыянальнае багацце, абуджаюць думку і хвалююць пачуцці.

Па-другое, гродзенцы прывезлі на Дэкаду сапраўдную **самадзейнасць** — творчасць хлебаробаў і будаўнікоў, даярак і пастухоў, служачых і студэнтаў. Самадзейнасць не за грошы і не па абавязку службы, а па абавязку сэрца, ад вялікай любві да музыкі, песні і танца, да паэтычнага слова. Зразумела, адно ўражанне, калі на сцэну выходзіць дырэктар або мастацкі кіраўнік РДК, нярэдка чалавек з вышэйшай музычнай адукацыяй, і, пераймаючы эстрадных спевакоў, пачынае томна і нудна разводзіць «Разведенные мосты» Бабаджаняна, і зусім іншае, калі на сцэну нясмела і сарамліва, бянтэжачыся ад хвалявання, выходзяць простыя вясковыя дзяўчаты — сёстры Грыгуць і Брыцько з калгаса «Запаветы Ільіча» Ваўкавыскага раёна і зусім бясхітрасна, «непрафесіянальна», але вельмі шчыра і задушэўна, — так, як на полі ці ў лузе ў час адпачынку пачынаюць спяваць цудоўную народную песню «Люблю наш край». Адно ўражанне, калі хлебаробы калгаса «Рассвет» Астравецкага раёна таленавіта і спрытна выконваюць вясёлы жартоўны літоўскі танец «Сяню-полька» («Полька старых») або калі тры пакаленні Тарговічаў, што называецца, «рэжуць» «Польку-нарачанку», і зусім не тое, калі на сцэне пачынае іржава скрыпець на мадэрнісцкі лад самы што ні ёсць правінцыяльны рэстаранны «джазік» — эстрадны аркестр. Самадзейнае мастацтва — гэта ўсё-такі **народнае** мастацтва — па самой сутнасці, па духу, па выкананню. Гэта мастацтва шырокіх працоўных мас, і не трэба яго падмяняць ні модным эстрадным крыўляннем, ні бяздарным скараспелым эрзацам на вытворчую «актуальную» тэму. Гродзенцы, да іх гонару, гэтыя элементарныя ісціны разумеюць.

Па-трэцяе, гродзенцы ў непараўнаўча большай ступені, чым іншыя, выступілі на Дэкадзе як прадстаўнікі самадзейнага мастацтва **Беларусі**, беларускага народа, мастацтва таленавітага і самабытнага, непаўторны нацыянальны каларыт якога адчуваўся ва ўсім — і ў рэпертуары, і ў выкананні, і ў мастацкім афармленні (касцюмы, сцэна і інш.). У гродзенцаў беларускія нумары — г. зн. беларускія народныя песні і танцы, творы беларускіх паэтаў і кампазітараў, прафесіянальных і самадзейных —

(Заканчэнне на 3-й стар.).

МАСТАЦТВА ПАВІННА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ

Дзеячы мастацтва рэспублікі горача абмяркоўваюць вынікі сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, якая адбылася 17 снежня мінулага года ў Доме прыёмаў на Ленінскіх гарах.

Выказванні Першага Сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова аб народнасці нашага мастацтва, аб шкоднасці адхіленняў ад прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму, даклад сакратара ЦК КПСС Л. Ф. Ільічова знаходзяць гарачую падтрымку ўдзельнікаў адкрытых партыйных сходаў, якія адбываюцца ў гэтыя дні ў творчых арганізацыях і мастацкіх навучальных установах. На гэтых сходах узнімаюцца канкрэтныя пытанні творчага жыцця, абмяркоўваюцца далейшыя шляхі развіцця мастацтва.

У сённяшнім нумары мы змяшчаем справаздачы аб адкрытых партыйных сходах, якія адбыліся ў радзе творчых арганізацый і ўстаноў горада Мінска.

Пачуццё высокай адказнасці за ідэйную чысціню савецкага мастацтва панавала на адкрытым партыйным сходзе ў Тэатры імя Янкі Купалы, дзе вялася гаворка аб значэнні снежаньскай сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі.

Ва ўступным слове народны артыст БССР С. Бірыла падкрэсліў важнасць вынікаў гэтай сустрэчы для ўсяго савецкага мастацтва.

— Партыя заўсёды своечасова падказвае нам верны напрамак творчасці, — гаворыць прапоўца.

Гаворачы аб пытаннях, узнятых у дакладзе тав. Ільічова, С. Бірыла звярнуў асаблівую ўвагу на тэзіс аб тым, што каштоўнасць мастацтва мераецца яго падпарадкаванасцю інтарэсам народа.

Вернасць купалаўскіх майстроў рэалізму падкрэсліў у сваім выступленні і ўдзельнік сустрэчы ў Доме прыёмаў народны мастак БССР З. Азгур. Ён спыніўся на гісторыі ўзнікнення абстракцыянісцкага «вучэння» ў Беларусі ў першыя гады Савецкай улады, расказаў пра апалагетаў гэтага рэакцыйнага напрамку ў мастацтве — Шагала, Малевіча і іншых.

Гаворыць народны артыст СССР П. Малчанаў:

— Я заўсёды ваяўніча стаяў і стаю на пазіцыях сацыялістычнага рэалізму. Абстракцыянізм мне варожы як мастаку, камуністу і грамадзяніну. Але я супраць дагматычнай абмежаванасці ў вызначэнні межаў самога рэалізму.

Перайшоўшы да творчасці беларускіх мастакоў, Малчанаў падзяліўся сваімі ўражаннямі аб сёлетняй і леташняй рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках, выказаў меркаванні адносна манументальнай прапаганды на вуліцах Мінска.

— Нельга, — працягвае П. Малчанаў, — каб справядлівую, патрэбную партыйную крытыку скарысталі ў сваіх нячыстых мэтах дагматыкі. Інакш мы пазбавімся найцудоўнейшай уласцівасці нашага мастацтва — шматграннасці стыляў, манер і жанраў. Але гэтага не здарыцца, бо партыя разгарнула перад мастакамі шырокае поле дзейнасці і падтрымлівае сапраўднае наватарства.

Думкі Малчанава развіваў галоўны мастак тэатра заслужаны дзеяч мастацтва БССР А. Грыгар'янц.

Ён выказаў занепакоенасць тым, што той-сёй з тэарэтыкаў-мастацтвазнаўцаў імкнецца шукаць абстракцыянізм там, дзе яго зусім няма. Гэта, — гаворыць прамоўца, — ідзе ад недастатковага разумення сутнасці справы. Нельга, каб барацьба супраць абстракцыянізму ператваралася ў «кампанію» накшталт тых даўнейшых, якія асуджаны партыяй.

— Нарада ў Доме прыёмаў буйным планам узняла пытанні нашага мастацкага жыцця, — сказаў галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтва БССР Ю. Шчарбакоў. Асабліва глыбокі сэнс снежаньскай сустрэчы Ю. Шчарбакоў бачыць у тым, што партыя ўмее цаніць сапраўдныя таленты і накіроўваць іх у правільнае рэчышча.

У заключэнне Ю. Шчарбакоў заклікаў захоўваць чысціню рэалістычных крыніц савецкага мастацтва, усяляк спрыяць сваёй творчасцю ўзбагачэнню культуры будаўнікоў камуністычнага грамадства.

Аб неабходнасці канкрэтнага аналізу пры ацэнцы творчасці кожнага мастака гаварылі заслужаны артыст БССР М. Яроменка і артыст Р. Філіпаў.

Народны артыст СССР Б. Платонаў і заслужаная артыстка БССР З. Браварская заклікалі калектыў да таго, каб узнятыя пытанні заўсёды заставаліся ў полі зроку кожнага работніка тэатра, каб пачатая размова працягвалася ў практычнай дзейнасці — на рэпетыцыях, абмеркаваннях п'ес і спектакляў, семінарах па марксісцка-ленінскай эстэтыцы.

На сходзе выступіў намеснік міністра культуры БССР М. А. Мінковіч. Ён адзначыў вялікую плённасць размовы, якая адбылася ў калектыве.

Стварэнне спектакляў, вартых нашага сучасніка — будаўніка камуністычнага заўтра, — такая тэма гаворкі, якая адбылася на адкрытым партыйным сходзе ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры імя М. Горкага. На сход артысты запрасілі З. Азгура.

Даклад аб развіцці савецкага мастацтва, аб задачах, якія стаяць перад калектывам тэатра, зрабіў галоўны рэжысёр М. Співак. Затым выступіў З. Азгур. Ён падрабязна расказаў аб гістарычнай сустрэчы, аб шчырай размове работнікаў мастацтва з кіраўнікамі Камуністычнай партыі.

У спрэчках выступілі артысты Г. Абуховіч, І. Шаціла, галоўны мастак В. Галубовіч, начальнік Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР Я. Парватаў. Яны асудзілі фармалістычныя хібы ў творчасці асобных мастакоў і кампазітараў, гаварылі аб высокіх партыйных прынцыпах савецкага мастацтва, аб выхаванні маладых артыстаў.

Пра высакародную ролю нашага мастацтва і літаратуры, пра эстэтычнае выхаванне моладзі гаварылі ўдзельнікі адкрытага партыйнага сходу ў Белдзяржкансерваторыі.

Рэктар кансерваторыі Ул. Алоўнікаў, які выступіў з дакладам, а таксама ўдзельнік сустрэчы ў Доме прыёмаў на Ленінскіх гарах кінематаграфіст М. Фігуроўскі падрабязна расказалі пра цікавую гутарку, парады, выказванні М. С. Хрушчова, прааналізавалі глыбокі і змястоўны даклад Л. Ф. Ільічова.

Ул. Алоўнікаў гаварыў пра музычна-асветніцкую работу калектыву кансерваторыі сярод насельніцтва, спыніўся на задачах паляпшэння прафесіянальнага выхавання студэнтаў, падрыхтоўкі іх да самастойнай работы. Кансерваторыя павінна выпускаць музыкантаў высокай кваліфікацыі, каб яны здолелі сваёй творчасцю ўзбагаціць беларускае мастацтва. Пасрэднасць і бяздарнасць — рэзерв фармалізму і абстракцыянізму.

Дацэнт М. Шнейдэрман гаварыў аб джазе, аб фактах непатрабавальнага падбору рэпертуару, што выконваецца на танцавальных пляцоўках, у клубах, а часам і па радыё.

На сходзе ішлі ажыўленыя спрэчкі вакол праблемы джаза. К. Сцепанцэвіч перакананўча адзначыла, што трэба змагацца са скажэннямі ў лёгкай музыцы, нельга кідацца да прымітывізму. Заклік «Далоў джаз!» — перагіб, памылка. Джаз павінен быць, ён мае права на жыццё, але яго музыка павінна быць рэалістычнай, меладычнай і напеўнай.

К. Сцепанцэвіч крытыкавала вучэбныя планы, гаварыла аб недахопах у арганізацыі набору ў кансерваторыю. Яна раіла пачаць цяпер падрыхтоўку да правядзення новага набору, каб у кансерваторыю магла паступаць таленавітая моладзь з перыферыі.

Педагог-музыказнаўца Л. Мухарынская спынілася на некаторых тэарэтычных пытаннях музыкі. Ідэалагічнаму выхаванню моладзі ў кансерваторыі прысвяціў сваё выступленне кандыдат філасофскіх навук А. Санкоў. Кампазітар М. Аладаў рашуча асуджаў абстракцыянізм як антынародную з'яву.

Удзельнікі сходу прынялі рэзалюцыю, у якой выказалі шчырую ўдзячнасць партыі і ўраду за клопаты аб развіцці літаратуры і мастацтва, абавязаліся працаваць так, каб выхоўваць глыбокіх знаўцаў музыкі, таленавітых выканаўцаў, кампазітараў.

Сход камуністаў і ўсяго калектыву рэспубліканскага Тэатра юнага гледача па абмеркаванню матэрыялаў сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з работнікамі культуры выліўся ў прынцыповую размову аб шляхах развіцця беларускага тэатральнага мастацтва, якое з першых крокаў свята прытрымлівалася і прытрымліваецца рэалістычных традыцый.

— Рэалізм, ідэйнасць, партыйнасць, — гаворыць дырэктар тэатра Ул. Стэльмах, — заўсёды вызначалі творчасць вядучых калектываў рэспублікі — тэатраў імя Я. Купалы і Я. Коласа. Гэтых вялікіх традыцый павінен прытрымлівацца і наш малады калектыў. Наш абавязак — выхоўваць моладзь у духу камунізма, фарміраваць яе эстэтычны густ. А гэта патрабуе ад нас непрымірымасці да праяў абстракцыянізму і фармалізму.

— Усякае мастацтва, адарванае ад жыцця, — падкрэсліў у сваім выступленні галоўны рэжысёр тэатра Б. Дакутовіч, — парушае цэласнасць мастацкага вобраза. Такая небяспека існуе і ў мастацтве акцёра.

На сходзе выступілі артысты Г. Ручымскі, А. Бяляеў і іншыя.

Удзельнікі сходу прынялі рэзалюцыю, якая заклікае калектыў ствараць высокамастацкія пастаноўкі, выхоўваць моладзь у духу камунізма.

У Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета на адкрытым партыйным сходзе з дакладам выступіў сакратар партарганізацыі тэатра тав. Бобрыкаў.

Галоўны мастак тэатра Я. Чамадураў у сваім выступленні рашуча асудзіў абстракцыянізм у выяўленчым мастацтве і на канкрэтных прыкладах паказаў усю спустошанасць гэтага «творчага» напрамку.

Слова бярэ галоўны дырыжор тэатра Л. Любімаў. Ён гаворыць пра адставанне музычнай крытыкі ад жыцця, з-за чаго іншы раз суб'ектывісцкія ацэнкі музыказнаўцаў дэзарыентуюць грамадскасць і гледача. Прамоўца падкрэсліў, што галоўнай задачай тэатра з'яўляецца стварэнне спектакляў на тэмы сучаснасці на высокім ідэйна-мастацкім узроўні. У сувязі з гэтым востра паўстае задача ўмацавання сувязі тэатра з Саюзам кампазітараў.

Выступае мастацкі кіраўнік тэатра Д. Смоліч. Ён адзначыў, што сацыялістычны рэалізм з'яўляецца адзіным шляхам для развіцця савецкага мастацтва і што тэатр у сваёй творчай дзейнасці цвёрда стаіць на партыйных пазіцыях.

Аб пачэсных задачах тэатра ў развіцці беларускай нацыянальнай культуры і эстэтычным выхаванні працоўных гаварыў дырэктар тэатра Ф. Жэгалаў.

З вялікай прамовай перад калектывам выступіў З. Азгур.

Сход аднадушна прыняў рэзалюцыю.

У рабоце сходу прыняў удзел міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў.

Слесар Георгій Сакалоўскі працуе на мінскім заводзе «Кінадэталь» нядаўна, але сваёй добрай працай ён заваяваў павагу сярод рабочых прадпрыемства. Георгій актыўна ўдзельнічае ў грамадскай рабоце, вучыцца на IV курсе машынабудаўнічага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута.

Фота Ул. КРУКА.

Пісьменнік і час

ТАЛЕНТ — ГЭТА ЯШЧЭ НЕ ЎСЁ!

Ул. ЖЫЖЭНКА

БАДАЙ, самая адметная і прывабная рыса шматнацыянальнай савецкай літаратуры сённяшніх дзён — яе разнастайнасць: разнастайнасць жанраў, тэматыкі, індывідуальных творчых манер. У прозе, паэзіі, драматургіі побач з выпрабаванымі басамі сталых «маэстро» чуваць звонкія, не падобныя адзін да аднаго маладыя галасы. Яны з кожным днём мужнеюць, набіраюцца сілы. Штогод мы маем магчымасць вітаць з'яўленне новых імёнаў, і няхай не заўсёды гэта таленты першай велічыні — ужо тое, што амаль кожны з маладых свядома імкнецца сказаць сваё, свежае слова, знайсці сваю інтанацыю ў размове з чытачом, ужо гэта абяцае ў будучым шчодры плён.

Мы гаворым: «свядома імкнецца», бо дух наватарскага пошуку, як ніколі, уласцівы сёння нашай літаратуры. Адразу ж растлумачым, што мы будзем мець на ўвазе, калі далей у артыкуле з'явяцца словы — «новае» і «наватарства». Гэта ні ў якім разе не стыль яшчэ — у тым сапраўдным значэнні, якое пацвярджаецца **практыкай літаратуры** і адпавядае тэарэтычным палажэнням. Разгорнем БСЭ, том 41-ы. Чытаем, між іншым, і такое: «стыль — устойлівая агульнасць вобразнай сістэмы, сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці, абумоўленая адзінствам ідэйнага грамадска-гістарычнага зместу». Вось гэта вельмі істотная якасць, магчыма, нават адна з галоўных — **устойлівая**. І калі мы зараз гаворым пра «новае» і «наватарства», дык гаворка ідзе пра **пошукі прыёмаў і сродкаў**, якія **накапліваюцца** ў творах пераважна маладых пісьменнікаў, але пакуль што не сталі **ўстойлівымі**. Гэта значыць, што «новае» і «наватарства» зараз стасуюцца да творчых пошукаў, знаходак і накаплення ў галіне стварэння сістэмы, якую наўрад ці можна лічыць досыць акрэсленай.

Не сакрэт, што ёсць наватарства і «наватарства». У розныя часы знаходзіліся ахвотнікі здзівіць, аглушыць чытача патокам незвычайных стылявых прыёмаў, штучных моўных наватвораў, каб за гэтым стракаценнем і трэскам схаваць сваю абыякавасць да надзённых праблем часу. Але кожны, хто ўважліва сочыць за нашай літаратурай апошніх год, ведае, што такога спекулявання на фармальным наватарстве ў нас няма або амаль няма. Высокі грамадзянскі пафас, гарачая заклапочанасць у тым, каб мастацкае слова з поўнай аддачай працавала на сучаснасць — вось што нязменна прысутнічае ў творах пісьменнікаў, якія свядома шукаюць шляхі **да ўзбагачэння, да пашырэння** магчымасцей таго **адзінага** стылю, што выпрацаваны нашай літаратурай на працягу дзесяцігоддзяў творчай практыкі. А што ў нашыя дні гэтыя пошукі ідуць асабліва ўзмоцнена, дык гэта зусім зразумела і натуральна.

РОЗДУМ МЕРКАВАННІ ПАЛЕМІКА

Па-першае, тут трэба бачыць магутную рэакцыю на доўгія гады вымушанай аднастайнасці, панавання адзінага «бездакорнага» густу, ва ўгоду якому нават такія мастакі, як М. Шолахаў, А. Фадзееў, А. Даўжэнка (прыгадайце яго нядаўна апублікаваныя дзённікі) павінны былі «наступать на горло собственной песне».

Па-другое, калі гаворка ідзе аб фармальным наватарстве, нельга адмаўляць пэўнага ўплыву на густы чытача і на літаратурную практыку лепшых дасягненняў літаратуры Захаду. Мы не можам узяць, скажам, Хэмінгуэя, або Сараяна, або Рэмарка, надзвычай папулярных у нас у апошнія гады, за духоўных настаўнікаў, але было б недарэчна і смешна заплюшчваць вочы на іх выдатныя адкрыцці ў галіне мастацкай формы. Не сляпое перайманне, па шляху якога пайшлі некаторыя мастакі і якое так жорстка асудзіў М. С. Хрушчоў пасля агляду выстаўкі маскоўскіх мастакоў, а свядомае, асэнсаванае авалоданне лепшымі здабыткамі сусветнай літаратуры — у гэтым знаходзяць для сябе нямала карыснага пісьменнікі-наватары.

А галоўнае, зразумела, тое, што мы жывём у час самых напружаных пошукаў новага, самага гарачага біцця творчай думкі.

Вельмі важна падкрэсліць, што ўсе гэтыя **аб'ектыўныя** стымулы наватарскіх пошукаў адбіваюцца ў свядомасці не толькі пісьменніка, але і чытача. Калі памножыць іх на сённяшні небывала высокі эстэтычны, эмацыянальны і інтэлектуальны ўзровень масы чытачоў, робіцца зразумелай павышаная цікавасць да твораў прызнаных наватараў — Ю. Бондарава, В. Аксёнава, Г. Бакланава, Б. Балтэра, да якіх можна з поўным правам залічыць і В. Быкава.

Тут варта прыгадаць літаратурны лёс рамана В. Катаева «Час, наперад!». Гэта была вельмі смелая спроба адмовіцца ад традыцыйных прыёмаў жанра, якая ў пэўнай ступені апраўдвалася навізной матэрыялу, індустрыяльнай тэмай. Надзвычайная сцісласць у апісаннях, кінематаграфічная змена кадраў, наўмысны падбор моўных сродкаў павінны былі перадаць паскораную хаду часу, тэмпы індустрыялізацыі.

«Час, наперад!» меў, вядома, сваіх прыхільнікаў, але быў стрымана прыняты масай чытачоў, а праз некалькі год зрабіўся адно здабыткам падручнікаў па літаратуры. І сам В. Катаеў, зразумеўшы, мабыць, пэўную штучнасць сваіх пошукаў, адмовіўся надалей ад гэтай манеры.

Нам скажуць, што ў гэтым творы В. Катаеву здрадзіў яго талент, што за грукатам бетонамяшалак тут «не чуваць» галасоў людзей. Гэта часткова так, але, на нашу думку, не меншую ролю адыграла і тое, што час не вымагаў яшчэ такога рашучага адыходу ад традыцый, што чытач не быў яшчэ досыць падрыхтаваны.

Сёння наватарскія вершы Я. Еўтушэнкі і Э. Межалайціса, Р. Раждзественскага і А. Вазнясенскага ўжо нікога не здзіўляюць. Наватарскія па сюжэтнай пабудове і творчых прыёмах п'есы, часам нават яшчэ больш «падноўленыя» пастаноўшчыкамі, ідуць на сцэнах амаль усіх тэатраў краіны. Верныя прыхільнікі К. Паўстоўскага, К. Федзіна або М. Стэльмаха, ніколькі не паступаючыся сваімі густамі, у той жа час з хваляваннем чакаюць кніжку тоўстага часопіса, ведаючы, што там будзе надрукавана новая аповесць Ю. Бондарава або В. Аксёнава.

БЕЛАРУСКАЯ літаратура ў сэнсе пераадолення стылявой аднастайнасці, бясспрэчна, зрабіла менш, чым, скажам, тая ж руская. У сваім артыкуле М. Стральцоў не без падстаў бачыць адну з прычын гэтага ў нашай прыхільнасці да «традыцыйных тэм». Сапраўды, калі традыцыйная тэма не абавязкова вымагае традыцыйнага вырашэння, то адкрыццё новых тэм, паглыбленне ў новыя пласты жыцця амаль немагчымыя без пошука, які мімаволі закранае і пытанні стылю, формы.

Гэты ўзаемны працэс ідзе ў нас, на жаль, вельмі павольна. І тым больш прыкра, што нават вядомыя майстры беларускай прозы, абараняючы свае ўласныя творчыя пазіцыі, — якія, дарэчы, усе мы паважаем і шануем і на якія ніхто не робіць замаху, — спрабуюць наогул адмаўляць пошукі. Чамусьці яны бачаць у «новым стылі» нейкую моду, накшталт вузкіх штаноў. Толькі ў адрозненне ад вузкіх штаноў, да якіх мы ўсе прызвычаіліся і прыйшлі да згоды, што гэта досыць зручна і ніколькі не пагражае нашай нацыянальнай самасвядомасці, «новы стыль» для Аляксея Кулакоўскага — гэта нешта заведама безнадзейнае, безгустоўнае і малапісьменнае. Спрачаючыся з М. Стральцовым, ён прыводзіць узорчык гэтага стылю ў тым выглядзе, як ён яму ўяўляецца: «...Ва ўсіх праводзімых мерапрыемствах я актыўна ўдзельнічаў. Прайшоўшая ў рэдакцыі нарада паказала, што ў цяперашні час такая крытыка не да месца. Зараз паўсюдна бачны нашы поспехі... і г. д.»

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ЭСТРАДА—МАСТАЦТВА БАЯВОЕ

Мікалай ЗОРЫН

Кожны, хто сваім мастацтвам імкнецца служыць народу, змагацца за ідэалы камуністычнай эпохі, — кожны артыст і мастак з хваляваннем успрыняў шчырую размову, што адбылася на сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі. І кожны з нас сёння пытае сябе: што я павінен вынесці для сябе з гэтай размовы?

На адным са звычайных эстрадных канцэртаў з глядзельнай залы на сцэну трапіла запіска, якую я, на правах канферансье, прачытаў: «Таварышы артысты! Мы імкнуліся трапіць на **эстрадны** канцэрт, але ашукаліся ў сваіх спадзяваннях. (Слова «эстрадны» было падкрэслена). Гэта — не эстрадная праграма».

Як мне здавалася, праграма канцэрта была цікавая і разнастайная па эстрадных жанрах, майстэрства выканаўцаў дастаткова высокае. Выступалі вядучыя салісты нашага Тэатра оперы і балета, майстры спорту СССР, вядомыя артысты эстрады, і гледачы аказвалі ім цёплы прыём.

І раптам — такая запіска!

Пасля заканчэння канцэрта ўдалося знайсці яе аўтара. Разгаварыліся.

— Не, гэта не эстрада. Ну, спявалі, танцавалі, размаўлялі... Але не было асноўнага — музыкі, — тлумачыў ён.

— Даруйце, а сола баяна, ксілафона?

— Так, але не было ні джаза, ні нават квартэта. І не было... — тут субяседнік праспяваў штосьці яўна незразумелае, нейкую сумесь «рока» з «бугі».

Стала неяк сумна на душы і падумалася, што, магчыма, мы самі, артысты эстрады, часам распаўсюджваем дрэнныя густы сярод гледачоў. Так, напэўна.

А што ж усё-такі ўяўляе сабою эстрада — гэты самы папулярны і масавы (пасля кіно) від мастацтва?

На жаль, у нас няма тэарэтычнай і гістарычнай літаратуры па эстраднаму мастацтву, ды і друк не вельмі песціць нас сваёй увагай. Таму нават сярод некаторай часткі работнікаў і кіраўнікоў эстрады няма выразнага ўяўлення аб сутнасці і мэтах яе, і многія з іх знаходзяцца часта ў палоне самых супярэчлівых думак і суб'ектыўных густаў.

Выдатны артыст М. Смірноў-Сакольскі даволі выразна выказаў галоўнае: «Эстрада — мастацтва надзвычай разнастайнае, шматпланавае і шматжанравае. Творчыя шляхі савецкай эстрады, як і шляхі ўсяго савецкага мастацтва, гэта не нікчэмная сцежка забаўляльнікаў... Гэта шлях высокаідэйнага служэння народу ў яго арліным палёце да вышыняў камунізма».

Так, эстраднае мастацтва сапраўды надзвычай шматграннае. Да яго можна аднесці не толькі артыстаў, што працуюць непасрэдна ў канцэртна-эстрадных арганізацыях, але і вялікую колькасць выканаўцаў з оперных і драматычных тэатраў, якія перыядычна выступаюць на эстрадзе, а таксама буйныя калектывы, як напрыклад, Дзяржаўны ансамбль танца БССР або Беларускі народны ансамбль песні і танца. Больш таго, нават калі слухаеш, скажам, негрыцянскія «спірычуэлс» у выкананні вядомага амерыканскага акадэмічнага хору пад кіраўніцтвам Р. Шоу, прыходзіш да высновы, што гэта таксама — эстрада.

На жаль, мы часта збядняем эстрадныя праграмы, абмінаючы так званыя «сур'ёзныя» жанры — ці гэта чытальнік з лірычнымі або гераічнымі вершамі савецкіх паэтаў, ці музыкант, у рэпертуары якога папулярныя творы кампазітараў-класікаў, — збядняем, выходзячы з аднаго незразумелага і памылковага ўяўлення, быццам эстрада павінна быць абавязкова толькі «вясёлай і лёгкай». Бясспрэчна, эстраднае мастацтва па сваёй прыродзе надзвычай аптымістычнае, дынамічнае і вясёлае. Але яму ўласцівы таксама і вострыя драматычныя сюжэты, і нават трагедыйныя. Гісторыя вядомы палымяныя выступленні на эстрадзе ў гады царскай рэакцыі вялікай рускай артысткі М. М. Ермолавай:

«Не плачьте над трупами
павших борцов,
Погибших с оружьем
в руках!»

А Фёдар Іванавіч Шаляпін з «Блыхой» і «Дубінушкай»! Падобных прыкладаў можна прывесці шмат.

Несправядліва забыты гераічны маналог, раёк, гумарыстычнае апавяданне, меладэкламацыя. Той жа погляд на эстраду як на нешта «вясёлае і лёгкае» часам прыводзіць да анекдатычных кур'ёзаў. Неяк са сцэны спусціўся даволі вопытны артыст, літаральна ўвесь мокры ад поту, і стомлена паваліўся ў крэсла. Яго спыталі, што з ім? Артыст з гонарам заявіў: «Паспрабуйце на працягу дваццаці мінут «накачваць» смех — тады будзеце ведаць!». Ён, бачыце, «накачваў» смех. Смех — як бы там ні было!..

У пагоні за «лёгкасцю» і «поспехам» у не вельмі патрабавальных гледачоў некаторыя артысты ўключаюць у свой рэпертуар «малінку» — нізкія па ідэйна-мастацкіх вартасцях творы, гаворачы проста — нізкапробныя. А належнага кантролю з боку кіраўніцтва няма. Ды і пра які кантроль можна гаварыць, калі, напрыклад, у нашай філармоніі эстрадная брыгада пры ўдзеле М. Пісьмана на працягу трох год гастраліравала дзесьці па гарадах і вёсках РСФСР.

Да гэтага часу ў нас практычна не прадугледжаны рэпетыцыйныя прастоі калектываў і выканаўцаў, і эстрадныя праграмы эксплуатуюцца, як кажуць, на знос. У цяжкім становішчы і наша рэжысура: яна вымушана займацца ў большасці толькі паднаўленнем і выпраўленнем зробленага, латанням дзірак і не вырашае галоўнага — стварэння цэласных праграм, паўнацэнных асобных нумароў.

Безумоўна, цяжка, вельмі цяжка знайсці эстраднаму артысту свой рэпертуар, падпарадкаваны пэўным сцэнічным законам эстрады. А ён, гэты рэпертуар, павінен быць адначасова і вельмі кароткі, надзённы і ў той жа час надзвычай выразны па сваіх мастацкіх якасцях. Ён павінен несці ў сабе элементы гумару, сатыры, публіцыстыкі.

Лепшыя творы літаратуры і музыкі, блізкія па будове да эстрады, безумоўна, знаходзяць або яшчэ знойдуць сваіх выканаўцаў. З гэтым справа лягчэй. А вось такія спецыфічна эстрадныя жанры, як сатырычныя куплеты і фельетоны, надзённыя раёк і частушка, рэпрыза для канферансье, камерныя дзвюх-трохмінутныя інтэрмедыі і скетчы, а таксама невялікія, але яркія музычныя п'есы для сольных інструментаў, эстрадна-інструментальных ансамбляў і джазавых аркестраў, — адкуль іх браць выканаўцу?

Многія, напэўна, знаёмы з выкрываўчымі, напоўненымі сатырычным бляскам куплетамі на міжнародныя тэмы ў выкананні выдатнага майстра савецкай эстрады І. Набатава, чулі знішчальна-трапныя частушкі, выкананыя ў канцэрце для дэлегатаў XXII з'езда партыі артыстамі П. Рудаковым і В. Нячаевым, або выкрываўчыя інтэрмедыі Ю. Цімашэнкі і Я. Бярэзіна, або куплеты «Вось гэта невядома» артыста нашай філармоніі Р. Дзідзенкі. І, зразумела, добрую рэакцыю слухачоў выклікала не толькі майстэрства гэтых выканаўцаў, а і вастрыня формы і актуальнасць літаратурнага матэрыялу, напісанага па гарачых слядах падзей.

Чаму такіх твораў мала ў нас на эстрадзе? Таму, што ў саюзах пісьменнікаў і кампазітараў Беларусі да гэтага часу існуе нейкі пагардлівы погляд на эстраднае мастацтва. Іншы раз можна нават пачуць ад некаторых: «Эстрада? Ды гэта ж несур'ёзная справа».

Не, мастацтва малых форм, эстрада — справа сур'ёзная. Я хачу тут прывесці выказванне пісьменніка Усевалада Вішнеўскага з яго артыкула «Артыст — палітработнік», апублікаванага яшчэ ў 1932 годзе: «Нас трэба біць за пагардлівыя адносіны да «малых форм»... Мастацтва, дарагое мастацтва кароткіх ударaў нават не можа так называцца». Вядома, што такія паэты, як Ул. Маякоўскі, Дзям'ян Бедны, прымалі гарачы ўдзел не толькі ў стварэнні асобных эстрадных твораў, але і цэлых праграм-аглядаў.

На жаль, нашы беларускія пісьменнікі, паэты-сатырыкі, кампазітары мала, вельмі мала пішуць для эстрады.

Не вельмі прыязна ставіцца да нас у апошні час і праўленне Саюза кампазітараў БССР. Не так даўно там было прынята рашэнне: стварыць секцыю, якая будзе аб'ядноўваць кампазітараў, што пішуць эстрадную музыку. На першым жа сваім сходзе было выбрана рабочае бюро секцыі, куды ўвайшлі Я. Глебаў, Ул. Чарадніченка і іншыя таварышы. Але праўленне саюза катэгарычна запратэставала супраць такога бюро: навошта яно, калі ёсць праўленне?! Секцыя без кіраўніцтва, па сутнасці, бяздзейнічае.

Кампазітары, якія раней плённа працавалі ў галіне эстраднай музыкі (Г. Вагнер, Ю. Бяльзацкі і іншыя), у апошні час пішуць для эстрады ўсё менш і менш.

Праўда, і ўмовы для развіцця і прапаганды эстраднай музыкі ў нас у рэспубліцы вельмі абмежаваныя. Фактычна ў нас ёсць толькі адзіны эстрадны аркестр — аркестр радыё і тэлебачання.

Даводзіцца шкадаваць, што ў Белдзяржфілармоніі няма такога прапагандыста эстраднай музыкі.

Усім вядома імкненне нашай моладзі да новых вобразаў, новых рытмаў у паэзіі і музыцы. Вядома і тое, што часам яна падпадае пад уплыў безгустоўшчыны, якую нясе замежнае мастацтва. Як супрацьстаяць гэтаму? Тут аднымі заклінаннямі і «табу» не абыдзешся. Толькі стварэннем новых, яркіх і арыгінальных твораў можна пазбавіцца ад гэтага ўплыву. Гэта з асаблівай сілай падкрэсліў нядаўні пленум кампазітараў Расійскай Федэрацыі, які спецыяльна абмяркоўваў пытанне далейшага развіцця эстраднай музыкі.

Эстрада праводзіць сапраўды вялікую работу. Дастаткова сказаць, што толькі эстраднымі артыстамі нашай філармоніі за год абслугоўваецца каля паўтара мільёна гледачоў. Калі ж дадаць яшчэ і тое, што мастацтва эстрады займае ключавыя пазіцыі і ў шматтысячнай арміі калектываў мастацкай самадзейнасці, апроч таго, калі дадаць усе эстрадныя канцэрты, што перадаюцца па радыё і тэлебачанню, дык лічба слухачоў будзе вельмі вялікая.

Таму неабходна, каб дзейнасць эстрады стала, нарэшце, прадметам шырокага асвятлення ў нашым друку, ад якога мы чакаем і падтрымкі і прафесіянальнага крытычнага разгляду канцэртных праграм, і размовы па пытаннях тэорыі эстраднага мастацтва і, нарэшце, аналізу творчасці асобных артыстаў, якія аддалі многія гады служэнню любімаму і баявому мастацтву.

У заключэнне я зноў хачу ўспомніць запіску і гледача, які шкадаваў, што ў канцэрце не было чагосьці накшталт «рока» і «бугі». Мне здаецца, што гэтае «штосьці» — вельмі зрадні мастацтву абстракцыяністаў: бяссэнсавае, кідкае і пустое. Нельга, каб людзі так разумелі эстраду. Трэба пытанні яе спецыфікі і развіцця распрацоўваць і асвятляць, ставіць перад самімі яе мастакамі і выносіць на шырокае абмеркаванне грамадскасці.

Усё гэта паможа нам ствараць першакласныя эстрадныя творы і праграмы, якія будуць адлюстроўваць нашу гераічную рэчаіснасць. Эстрада — мастацтва баявое, і яно можа справіцца з гэтай задачай.

«МАСТАЦТВА НАЛЁЖЫЦЬ НАРОДУ»

Брашура з тэкстамі выступленняў тав. Л. Ф. Ільічова

Дзяржаўнае выдавецтва палітычнай літаратуры выпусціла масавым тыражом брашуру «Мастацтва належыць народу». У ёй змешчаны тэксты прамоў сакратара ЦК КПСС тав. Л. Ф. Ільічова на сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва 17 снежня 1962 года і на пасяджэнні ідэалагічнай камісіі пры ЦК КПСС з удзелам маладых пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, работнікаў кіно і тэатраў 26 снежня 1962 года.

ТАСС.

МУЗЕЙ ПАПАЎНЯЕЦЦА НОВЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ

Івянецкі мемарыяльны музей Ф. Э. Дзяржынскага папоўніўся новымі матэрыяламі пра палымянага бальшавіка-ленінца.

Сярод дакументаў — перапіска Ковенскага і Вяцкага губернатараў, якая адносіцца да моманту высылкі Ф. Э. Дзяржынскага ў 1898 годзе ў Вяцкую губерню пад адкрыты нагляд паліцыі. У копіі адносіны губернатара Вяткі на імя міністра ўнутраных спраў выкладаецца просьба ўжыць адзін з артыкулаў палажэння аб паліцэйскім наглядзе, таму што Ф. Э. Дзяржынскі «праяўляе крайнюю ненадзейнасць у палітычных адносінах і паспеў ужо набыць уплыў на некаторых асоб, якія былі зусім надзейнымі». Паступіла таксама копія данясення ад 15 лютага 1899 года аб уцёках паднаглядна з сяла Кайгародскага, які «невядома куды знік», і паведамленне начальніка Варшаўскага губернскага жандарскага ўпраўлення, што расшукваемы арыштаван у ліку ўдзельнікаў сходкі рабочых і ўзят пад варту.

БЕЛТА.

У ПЛАНЕ ТЭАТРА —12 ПРЭМ'ЕР

Цікавым і разнастайным абяцае быць 1963 год у Магілёўскім абласным драматычным тэатры. У хуткім часе адбудзецца прэм'ера спектакля «Пад адным небам» па п'есе А. Маўзона. Пачынаецца работа над спектаклямі «Маскарад» М. Лермантава і «Перад вячэрай» В. Розава.

У рэпертуар тэатра ўключаны таксама п'есы «Лазня» Ул. Маякоўскага, «Марыя Сцюарт» Ф. Шылера, «Акіян» А. Штэйна, «Дзённік жанчыны» К. Фіна і інш.

Вырашана сёлета паставіць п'есу мясцовага драматурга Я. Тарасава «Гэта было ў Магілёве». Яна апавядае аб гераічнай барацьбе магілёўскіх падпольшчыкаў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Рускі драматычны тэатр імя М. Горкага паставіў спектакль «Чорныя птушкі» па п'есе М. Пагодзіна. На нашым здымку — сцэна са спектакля. У ролях: Марыі Міхайлаўны — артыстка І. Лакштанава, Крутаярава — Р. Качаткоў, Ніны — артыстка Л. Былінская.

Заўвагі на палях

«НОСИТЕЛЬСТВО МИКРОБОВ»...

Паміж сабою ўрачы нярэдка размаўляюць на прафесіянальнай, мала каму зразумелай мове. Ніхто не можа папракнуць іх за гэта.

Але вось урачу трэба пагаварыць з хворым, растлумачыць яму прычыну ўзнікнення і спосабы папярэджання хваробы. Якой у гэтым выпадку павінна быць мова ўрача? Скажаце, простай і зразумелай. А што, калі ўрач пачне размаўляць з вамі такім чынам:

«С профилактической целью, для предупреждения хронических гастритов имеет значение строгая диета после перенесенного острого гастрита, общий гигиенический режим, регулярное питание в семейной обстановке, доброкачественность употребляемых в пищу продуктов, оздоровление полости рта, тщательное прожевывание пищи, устранение инфекционных очагов в организме, запрещение употребления спиртных напитков и курения».

Альбо так:

«Причиной ухудшения самочувствия и потери трудоспособности является недостаточность кровообращения, которая развивается вследствие повторного ревматического приступа, поэтому важной задачей является предупреждение возвратного ревматического процесса».

— Даволі! — усклікнеце вы. — Немагчыма, каб урач так размаўляў з людзьмі. Ніхто так і не размаўляе.

У тым і справа, дарагі чытач, што размаўляе!

Хочаце пераканацца? Калі ласка. Загляніце ў памяткі, якія выпусцілі летась Мінскія гарадскі і абласны дамы санітарнай асветы. Вось некалькі вытрымак з гэтых памятак:

«Дело не только в мытье рук, вырабатывалась в человеке система ухода за своим организмом, строгий режим дня, которым он пользовался».

«Строго придерживаясь всех гигиенических правил, советует врач, каждая девушка, укрепив свое здоровье, будет полноценным человеком нашего социалистического общества».

«Как правило, раз в неделю моется в бане, регулярно меняя белье. Этот пример, скажу вам, достойный подражания».

«Важно, что распорядок соблюдался изо дня в день и стал для Сони твердым, незыблемым распорядком».

Памяткі падпісаны кандыдатамі навук, а стракацяць такімі выразамі, як «носительство микробов», «не сдавался перед нею», «случается, когда», «находящихся в соседстве». Жах бярэ, калі думаеш, што ўсё гэта выдадзена тыражамі ў 10 і 20 тысяч экземпляраў.

Мінскія гарадскі і абласны дамы санітарнай асветы пачалі карысную справу, наладзіўшы выпуск папулярных памятак для насельніцтва. Але, таварышы дзеячы фронту санітарнай асветы, змагаючыся з інфекцыяй, не разносьце самі бацылы бескультурнасці, не распаўсюджвайце непісьменнасці!

АГОНЬ ПА ЛАЙДАКАХ І ГУЛЬТАЯХ

Многія рабочыя саўгаса «Ведрыч» Рэчыцкага раёна памятаюць выпадак у іх клубе. Агітбрыгада Рэчыцкага гарадскога Дома культуры ставіла сатырычны вадэвіль «Дзед Мярэжа праўду рэжа», дзе высмейваюцца гультаі, лайдакі, дрэнныя кіраўнікі калгасаў, травапольшчыкі. Зала цёпла прымала пастаноўку, ні на хвіліну не сціхаў рогат. І тут раптам пасля чарговага выбуху смеху з крэсла падняўся чалавек і, прыгінаючыся, пачаў хутка прабірацца да выхаду.

Калі б тады загарэлася святло, усе пазналі б у гэтым чалавеку брыгадзіра калгаса «Камунар» Заморава. Ён ніколі не чакаў, што яго — травапольшчыка — у клубе будуць крытыкаваць. А калі пачуў, не вытрымаў, паспрабаваў выйсці незаўважаным.

Але каля самых дзвярэй яго нехта заўважыў і на ўсю залу крыкнуў:

— Глядзіце, ды ён тут — Заморaў!

У гэты вечар уляцела і многім іншым. Дружна смяяліся ў зале, калі ў ролі гультайкі выступіла Н. Магрычава, работніца Рэчыцкай мэблевай фабрыкі.

Гледачы пазналі ў ёй Кацярыну Томку, якая замест таго, каб працаваць, увесь час швэндаецца па базары.

— Ведаюць жа, каго працягнуць трэба, — гаварыў пасля канцэрта брыгадзір трактарнай брыгады саўгаса Герой Сацыялістычнай Працы Сцяпан Фешчанка і дадаў: — правільна, дапамога ў нашай справе добрая.

Канцэрты агітбрыгады гарадскога Дома культуры карыстаюцца поспехам у працоўных раёна. Па іх просьбе складаюцца праграмы канцэртаў, арганізоўваюцца выезды ў калгасы і саўгасы раёна.

— Мэта нашых выездаў, — гаворыць кіраўнік агітбрыгады, ён жа адзін з аўтараў вадэвіляў «Дзед Мярэжа праўду рэжа» і «Рэйд газеты на борце «Ракеты», А. Фінкельберг, — памагаць праўленням калгасаў і партыйным арганізацыям працоўваць працоўную дысцыпліну, весці прапаганду перадавога вопыту.

Увесну агітбрыгада крытыкавала кіраўнікоў калгаса імя Кірава за недахопы ў палявых работах. А ўлетку самадзейныя артысты першымі павіншавалі калгаснікаў гэтай арцелі з паспяховым заканчэннем уборкі азімых. Яны і песню склалі:

Ой, як многа радасці на душы
у нас,
Мы з агітбрыгадаю едзем
у калгас.
Будзем песняй шчыраво
славіць маякі,
Хай баяцца крытыкі нашай
лайдакі!

«Жыць сучасным» — вось дэвіз калектыву агітбрыгады.

— Вось чаму, бываючы ў вёсках, — тлумачыць стараста агітбрыгады інструктар райкома камсамола Ліда Сыч, — мы запісваем многа фактаў з жыцця людзей, розныя цікавыя выпадкі і потым на сходзе агітбрыгады абмяркоўваем, якія з іх можна апрацаваць і ўключыць у свой рэпертуар. І вынікі нашых выступленняў заўсёды дзейсныя.

Часта можна бачыць на дарогах раёна аўтамашыну з надпісам на кузаве «Аўтаклуб». З калгаса ў калгас, з вёскі ў вёску едуць на ёй пасля свайго працоўнага дня ўдзельнікі агітбрыгады, каб парадаваць працаўнікоў вёскі новай песняй, танцамі, памагчы ім навесці парадак дома, у полі, на ферме. Магчыма, таму іх машыну называюць «хуткай дапамогаю». І трэба сказаць, што такую назву яна апраўдвае.

А. ЮШКО,
М. ДУБАВЕЦ.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА

ПРЫГАЖОСЦЬ У ШКЛЕ

Алег СУРСКІ

Каля гэтых твораў мастацтва — яны экспануюцца побач з жывапісам, графікай і скульптурай на сёлетняй мастацкай выстаўцы — гледачом авалодвае асаблівае пачуццё, якое выклікаюць звычайна элегантнасць і прыгажосць. Менавіта яны надаюць усёй выстаўцы той сучасны тонус, якога часам так не хапае многім карцінам, графічным лістам і скульптурам. Творчасць беларускіх мастакоў шкла (а я маю на ўвазе іх творы) і на больш шырокіх выстаўках — усесаюзных і зарубежных — карыстаецца нязменным поспехам. І хоць гэтыя мастакі — А. Абрамава з Барысаўскага завода імя Дзяржынскага і мінчанка Г. Ісаевіч, нёманцы В. Мурахвер, Л. Мягкова, С. Раудве і Я. Гладкоў — вельмі розныя па сваіх творчых індывідуальнасцях, усім ім уласцівая адна каштоўная якасць: разуменне сучасных задач дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гэта не выпадкова. Усе яны цесна звязаны з вытворчасцю. Таму напрамак іх пошукаў не адрываецца ад зямлі. Бо ўсё, што ствараюць яны, абавязкова павінна ўлічваць канкрэтныя ўмовы вытворчасці, магчымасці заводаў, на якіх яны працуюць, тэхналогію, эканоміку, не гаворачы ўжо аб функцыянальнасці ствараемых імі рэчаў.

У кожным відзе мастацтва пошукі новых сучасных вырашэнняў павінны базіравацца на рэалістычнай аснове. Гэта датычыць і прыкладнога мастацтва. І калі ў нас яшчэ ствараюцца бытавыя і дэкаратыўныя вырабы з таго ж шкла архаічнага плана, народжанага эпохай праславутага аздабляльніцтва, — гэта не што іншае, як аднаўленне фармалізму, так сказаць, у перавернутым плане. І сапраўды, колькі яшчэ блытаніны і непаразуменняў прыносяць у развіццё прыкладнога мастацтва захавальнікі канонаў, якія пад выглядам рэалізму абараняюць архаічны стыль — усялякія падробкі шкла пад гранёны крышталь, распісныя вазы з натуралістычнымі пейзажамі і партрэтамі, аляпаваты посуд, што паўтарае формы барока, дзе рэалізмам і не пахне. Бо рэалізм сучаснага дэкаратыўнага мастацтва выходзіць, перш за ўсё, з рэальнага прызначэння рэчы, рэальных уласцівасцей матэрыялаў і сучаснай тэхналогіі яе вырабу, нарэшце, з рэальнага асяроддзя, у якім гэтая рэч жыве.

І калі любуешся прыгожымі дэкаратыўнымі вазамі, блюдамі, утылітарным посудам са шкла, што экспануюцца ў чатырох невялікіх вітрынах на выстаўцы, разумееш: менавіта гэтыя якасці надаюць ім высокую мастацкасць.

Як я ўжо сказаў, аўтарамі гэтых твораў з'яўляюцца вельмі розныя, кожны са сваім почыркам, мастакі.

Ужо шмат гадоў плённа супрацоўнічае з заводам імя Дзяржынскага мінская мастачка Галіна Ісаевіч. У сааўтарстве з пастаянным мастаком завода А. Абрамавай яны прадстаўлены на выстаўцы цікавым дэкаратыўным наборам дымчатага шкла. Гэта дзве вазы рознай велічыні і блюда. Гладкія, буйныя формы, плаўныя абрысы, адсутнасць якога б там ні было дэкору добра падкрэсліваюць высакароднасць матэрыялу, выяўляюць яго прыгажосць.

У крыху іншай манеры зроблена Г. Ісаевіч невялікая выдзімная ваза тоўстага дымчатага шкла з гарошынамі, нанесенымі гравіроўкай. Вельмі дэкаратыўная, яна будзе добра глядзецца ў інтэр'еры, асабліва ў жылым.

Прадстаўлена на выстаўцы і асобная работа А. Абрамавай.

Дарэчы, у асноўным мы ведаем Абрамаву як мастака па крышталю, але прыбор для соку з гладкага дымчатага тонкага шкла з празрыстымі ручкамі, зроблены ёю, вельмі цікавы. Ён адрозніваецца высакароднай прастатой і прыгажосцю, што асабліва прыемна ва ўтылітарнай рэчы.

Ад завода «Нёман» у выстаўцы ўдзельнічаюць чатыры маладыя мастакі. Двое з іх — выпускнікі Ленінградскага вышэйшага мастацка-прыкладнога вучылішча імя Мухінай. На заводзе яны працуюць ужо тры гады. Шмат імі зроблена за гэты час для паляпшэння выпускаемай заводам прадукцыі масавага ўжытку. І ў тым, што сёння на прылаўках магазінаў пачала паяўляцца больш сучасная прыгожая і танная прасаваная пасуда са шкла (наборы для кампоту, селядзечніцы, маслёнкі, цукроўніцы, вазы для садавіны і інш.), — немалая заслуга, напрыклад, Уладзіміра Мурахвера, які шмат і плённа працуе над стварэннем сучасных узораў для прэса.

Выставачныя яго работы сведчаць аб рознабаковасці таленту мастака, аб тым, што ён не спыняецца на дасягнутым і шукае новыя формы і дэкаратыўныя прыёмы афармлення вырабаў са шкла. Тры яго вазы «Гатычны горад» — тонкія, узнятыя ўвышыню, з лёгкім дэкорам то ў выглядзе вертыкальнай крэалітавай паласы, якая падкрэслівае выцягнутасць формы, то ў выглядзе празрыстых наплываў ці апалавай падфарбоўкі з сярэдзіны, — вельмі вобразныя і сучасныя.

Цікава яго імкненне знайсці выяўленчыя моманты ў дэкаратыўных рэчах. Я маю на ўвазе вазы «Сядзячая», «Задумаўся», «Узбечка». Усе яны з тонкага бескаляровага шкла, з лёгкай ручной гравіроўкай, усе вельмі вытанчаныя па форме і малюнку. Бадай, найбольш удалая з іх — «Сядзячая», дзе малюнак добра звязаны з формай пасудзіны, а мільгаценне зорак падкрэслівае празрыстасць і тонкасць шкла. Не менш прывабнасці і прыгажосці ва ўтылітарным дэсертным наборы — бескаляровае тонкае шкло з роспісам у выглядзе дэкаратыўных чорна-белых і чырвона-белых плям.

Вельмі рознапланавай мастачкай з'яўляецца і Людміла Мягкова, якая таксама шмат працуе над стварэннем узораў для масавай вытворчасці. Адметныя рысы яе творчасці — своеасаблівая мяккасць і лірызм. Гэта відаць і па выставачных работах, дзе прадстаўлены рэчы як дэкаратыўнага плана, так і ўтылітарныя. Вельмі сучасна выглядае яе набор з трох ваз, арыгінальных па свайму вобразнаму гучанню.

Рознай формы і розныя па колеру — дымчатая, марганцавая і разалінавая, — яны ствараюць адзіны каларыстычны ансамбль. Рэчы гэтыя хутчэй выставачныя, але яны знойдуць сабе месца і ў сучасным жылым ці грамадскім інтэр'еры. Радасна, што мастачка прапануе самыя разнастайныя дэкаратыўныя вырашэнні. У другой вітрыне стаяць дзве яе ж вазы для кветак — апал з медным рубінам. Побач — прыбор для віна («Негрыцянка»), дзе, выкарыстоўваючы багатыя магчымасці шкла, Л. Мягкова ўдала ўносіць ва ўтылітарную рэч выяўленчы пачатак. Яна добра абыгрывае форму празрыстых пасудзін, дэкарыраваных белай крэалітавай ніткаю і чорнымі марблітавымі ручкамі і коркай.

Бадай, крыху выпадае з агульнага лірычнага плана мастачкі дэкаратыўны ансамбль — дзве вазы «Святочныя» — вялікая пасудзіна і блюда з празрыстага шкла з вогненна-чырвонымі плямамі. Але ён можа знайсці сабе месца ў адпаведным інтэр'еры.

Ужо не раз на старонках рэспубліканскага і цэнтральнага друку адзначалася творчасць мастачкі завода «Нёман» Сільвіі Раудве, хоць яна зусім нядаўна пачала самастойна творча працаваць. Усяго год, як Раудве скончыла Эстонскі мастацкі інстытут, але ўжо зарэкамендавала сябе як цікавы мастак. На выстаўцы яна прадстаўлена дастаткова багата і разнастайна. Почырку яе ўласцівыя вастрыня, дынамічнасць, яна добра адчувае сучаснасць. У гэтым сэнсе паказальныя дзве яе тонкія празрыстыя вазы з раструбамі — «Ззянне». Лёгкая штрыхавая гравіроўка, незвычайнасць форм надаюць ім крыху экстравагантнае адценне, аднак гэты эксперымент пацвярджае, што мастачка ўмее самыя вострыя формы рабіць прывабнымі і прыгожымі. Напрыклад, зусім у іншым плане вырашаны ёю вялікая чорная ваза — марбліт з крэалітавай ніткаю — і бескаляровае глыбокае блюда для садавіны — таксама з крэалітавай ніткаю. Гэты дэкаратыўны ансамбль вельмі прыгожа глядзіцца на невысокай падстаўцы і добра ўпрыгожвае інтэр'ер выстаўкі.

Сільвія Раудве эксперыментуе не толькі ў празрыстым шкле. Вельмі прыемны яе набор з паліраванага крышталю — попельніцы і дзве вазы. Пазбаўленыя якога б там ні было дэкору, гладкія і масіўныя, яны добра перадаюць натуральнае багацце матэрыялаў. Прыгожа глядзіцца ў таўшчыні празрыстага шкла колер унутраных сценак (медны рубін), а форма, нібы аплыўшая, арганічна вынікае з тэхналогіі гуты — свабоднага выдзімання.

Спалучэнне колеру і матэрыялаў у вырабах С. Раудве заўсёды вылучаецца добрым густам і натуральнасцю. Характэрныя ў гэтым сэнсе і дзве яе дэкаратыўныя вазы для кветак апалавага шкла з бескаляровым крышталём, дэкарыраваныя чорным крышталёвым накладам, які своеасабліва расплываецца па гладкай паверхні, утвараючы цікавы адвольны малюнак. Прыемныя пералівы колеру і святла ўтвараюцца ў дзвюх іншых яе вазах «Залацістая нітка». Вельмі прыгожая па колеру яе ж невялікая каралавая вазачка для кветак.

Асобна хочацца сказаць яшчэ пра аднаго прадстаўніка завода «Нёман», які экспануе на выстаўцы свае творы — Яўгенія Гладкова. Ён працуе на заводзе майстрам і вучыцца завочна ў мастацкім інстытуце. Валоданне тэхналогіяй, адчуванне матэрыялу і прыродны талент дазваляюць яму знаходзіць вельмі натуральныя і тэхналагічныя формы вырабаў, якія не толькі заўсёды зручныя ў вытворчасці, але і прыгожыя. Вось, напрыклад, яго дэсертны набор з бескаляровага шкла з жоўтымі падпалінамі і чорнай марблітавай ручкай. Вельмі элегантна выцягнута і масіўная ваза, праз тоўшчу шкла якой прыгожа глядзіцца наплыў залатога рубіну. Тут добра выяўлена прыгажосць самога матэрыялу, а формы і лёгкі дэкор арганічна падкрэсліваюць гэтую прыгажосць, гавораць пра самабытнасць майстра.

І яшчэ два прозвішчы хочацца назваць у гэтай размове — майстроў Шыманскага і Багінскага. Гэта іх рукамі і рукамі іх таварышаў — нёманскіх шкладуваў увасоблены задумы мастакоў. Мне даводзілася назіраць за іх работай на заводзе. Колькі артыстызму, прывабнасці, прыгажосці ў кожным іх руху! Гэта вельмі прыгожае відовішча — назіраць, як расплаўленая празрыстая кропля шкла на канцы трубкі паступова набывае па волі майстра патрэбныя формы, як, астываючы, ператвараецца яна ў прыгожы выраб. Дарэчы, абодва майстры выступаюць і самі як аўтары творчых работ. Імі прапанаваны для вытворчасці арыгінальныя сувеніры ў народным плане.

Знаёмства з работамі беларускіх мастакоў па шклу прыносіць вялікае задавальненне. Прыемна бачыць, як з году ў год расце іх майстэрства, як па праву творчасць іх пачынае займаць вартае месца на мастацкіх выстаўках. У гэтым ёсць глыбокі сэнс. У эстэтычным выхаванні народа роля прыкладнога мастацтва не менш значная, чым жывапісу, скульптуры, графікі. Гэта мастацтва такое ж высокае і важнае. Нездарма развіццю яго ў апошні час аддаецца ўсё больш і больш увагі.

Л. ГУМІЛЕЎСКІ. «Юная». А. АНІКЕЙЧЫК. «Жаночы партрэт». І. МІСКО. «Студэнтка».

З рэспубліканскай мастацкай выстаўкі 1962 г.

ДЗЕНЬ ПЯТЫ, ЗНАМЯНАЛЬНЫ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

складаюць пераважную большасць і з'яўляюцца асновай канцэрта, у той час, як, скажам, у праграмах Віцебскай або Брэсцкай абласцей беларускія нумары складаюць непшта каля адной трэці: прыкладна трынаццаць — пятнаццаць з агульнай колькасці сорак — сорак пяць. Не ведаю, чым кіруюцца ў абласцях таварышы, адказныя за самадзейнасць, але толькі не клопатамі аб развіцці беларускай савецкай культуры і мастацтва—сацыялістычнага па зместу, нацыянальнага па форме.

Пры гэтым хачу падкрэсліць адну асаблівасць і думаю, што наўрад ці стане хто-небудзь спрачацца са мною: ідэя інтэрнацыянальнага братэрства, ідэя вялікай дружбы народаў прагучала ў канцэрце Гродзеншчыны ніяк не з меншай сілай, чым у канцэртах іншых абласцей. І Чайкоўскі, і Мурадэлі, і Холмінаў, і Грыг, і Шапэн, і Бізэ, і руская «Мяцеліца», і польская «Мазурка», і «Кубінскі танец», і літоўская «Полька старых», і ўкраінскія народныя песні «Рэве та стогне», і «Шчэдрык», і рускі жартоўны танец, і гумарэска Астапа Вішні — усё гэта вельмі хораша і дарэчы было ўплецена ў зладжаную, багатую і разнастайную праграму **беларускага** самадзейнага мастацтва Гродзеншчыны.

Калі на канцэрце Гродзенскай вобласці мяне не пакідала адчуванне, што я знаходжуся ў Беларусі і любуюся народнымі талентамі Беларусі, то на канцэртах іншых абласцей такое адчуванне прыходзіла толькі зрэдку. Складвалася ўражанне, што пры адборы нумароў на абласных аглядах, беларускія ўстаўляліся толькі дзеля прыліку, дзеля апраўдання: маўляў, чаго ж, вось вам, калі ласка, і беларускае мастацтва.

Становішча з рэпертуарам мастацкай самадзейнасці ў большасці абласцей яўна ненармальнае, і гэта не можа не выклікаць трывогі. Кідаецца ў вочы, што на самадзейную сцэну трапляе нямала рэчаў выпадковых, далёка не лепшых узораў сучаснай музычнай і песеннай творчасці і што такім чынам папулярызуецца і прапагандуецца зусім не тое, што трэба прапагандаваць і чым павінна жывіцца самадзейнасць. І вось гэтыя выпадковыя рэчы праходзяць нават на Дэкаду, атэстуючы публічна эстэтычныя густы і выканаўцаў, і яшчэ больш іх мастацкіх кіраўнікоў.

Няхай ні ў кога не ўзнікне падазрэнне, што я арыентую самадзейнасць толькі на народныя песні і танцы і ігнарую сучасныя творы аўтараў-прафесіяналаў. Зусім не! Я вітаю ў самадзейнасці творы сучасных паэтаў і кампазітараў — пры ўмове, што гэта творы высокаідэйныя і высокамастацкія, што яны нясуць народу праўду нашага веку, нашай эпохі, як «Бухенвальдскі набат» і «Красная Прэсня» Мурадэлі, паказваюць характво і высакароднасць душы савецкага чалавека, як «Раншняя песня» Дунаеўскага, «Людзі смелага сэрца» Холмінава, «Аршанская старонка» Алоўнікава.

Але калі б мне прыйшлося выбіраць паміж старой беларускай песняй «Цячэ рэчанька» і архісучасным «Разведенными мостами», то я, несумненна, спыніўся б на першай, на народнай песні. І не толькі я.

Хто быў на канцэрце Магілёўскай вобласці, той памятае, як доўга бушавала ў адзінадушным захапленні зала, выклікаючы на «біс» жаночы вакальны ансамбль Баркалабаўскага сельскага клуба, які праспяваў цудоўную старую народную песню «Цячэ рэчанька». І тыя ж самыя гледачы вельмі стрымана прынялі слабую сучасную песню Палікарпава «У нас сёння выхадны». Гэтак жа абыякава былі сустрэты песні «Полюбила я некрасивого» Ціханава і «Откровенные ребята» Аверкіна (Гомельская вобласць), «Твоя улыбка» Развалішынай (Брэсцкая вобласць), тыя ж «Разведенные мосты» Бабаджаняна (Віцебская вобласць).

Чаму ж старая народная песня ўсхвалявала, а новая, сучасная — не? Таму, што «Цячэ рэчанька» — песня надзвычай прыгожая, меладычная, а галоўнае, мае вельмі глыбокі і праўдзівы змест. Яна ярка і вобразна раскрывае трагічны лёс паднявольнай беларускай жанчыны ў далёкія часы мінуўшчыны. Я першы раз пачуў гэтую песню, і яна засталася ў маёй душы навек. Колькі гора-нядолі чуецца ў ёй, якім балючым сумам яна прасякнута! Песня прымушае думаць і яшчэ мацней ненавідзець праклятае мінулае, пасля такой песні хочацца працаваць з яшчэ большай сілай, працаваць дзеля шчасця людскога, каб гэтае праклятае мінулае не вярнулася ніколі.

А што ўсяляюць у тваю душу «Разведенные мосты»? На што яны натхняюць? Якую праўду раскрываюць? У параўнанні з песняй «Цячэ рэчанька» — вельмі маленькую, прыватную праўдачку. Дык чаму ж я павінен аддаваць ім перавагу? Толькі таму, што яны напісаны ў 1962 годзе? Але дата напісання сама па сабе яшчэ ні аб чым не гаворыць і не дае твору права называцца сучасным. Усё залежыць ад ідэйнага зместу і мастацкіх вартасцей.

Аб тым, што справа з рэпертуарам самадзейнага мастацтва не наладжана належным чынам, сведчаць і такія факты.

Ледзь не кожная вобласць прывезла на Дэкаду песню Калманоўскага «Ці хочуць рускія вайны?» Гэтак сама амаль што ўсе вобласці прывезлі венгерскі танец «Вігада». Гэтак сама і песню Холмінава аб Леніне. Добрыя песні, добры танец і добра, што яны бытуюць у народзе, выконваюцца ў самадзейных калектывах. Але чаму трэба ўсім ехаць на Дэкаду іменна з гэтымі творамі? Хіба няма іншых добрых песень аб Леніне і аб міры, іншых добрых танцаў? Адкуль такая аднастайнасць?

І яшчэ. Магілёўская вобласць прывезла на Дэкаду дзве песні аб гродзенскім Нёмане і ніводнай — аб магілёўскім Дняпры, хоць аб Дняпры ёсць песні, бадай, не горшыя, чым аб Нёмане. Скажуць: выпадковасць. Правільна! У тым уся і справа, што ў канцэртных праграмах вельмі многа выпадковага, — і гэта ёсць вынік самацёку або няўмелага кіраўніцтва арганізацыяй і развіццём мастацкай самадзейнасці. Каб не было так — не прыехалі б магіляўчане на Дэкаду без патрыятычнай песні аб Дняпры.

Непавагай да свайго нацыянальнага рэпертуару прыходзіцца тлумачыць і той факт, што для мастацкага чытання былі ўзяты толькі чатыры творы беларускіх пісьменнікаў: «Сведка» Багушэвіча, урывак з трылогіі «На ростанях» Коласа, урывак з паэмы Броўкі і сатырычныя вершы аўтара гэтых радкоў. Ці не занадта мала для шасці абласцей і горада Мінска? Віцебскія таварышы, напрыклад, не знайшлі ў праграме месца ні для Танка, ні для Куляшова, ні для Панчанкі, ні для каго з іншых выдатных нашых паэтаў і пісьменнікаў, затое другім нумарам праграмы пусцілі бездапаможны траскучы верш якогасьці Шура «Так і будзе».

Не магу не спыніцца яшчэ на адным факце, які мяне і здзівіў, і яшчэ больш—абурыў. Вельмі слаба на Дэкадзе было прадстаўлена самадзейнае мастацтва калгасных і саўгасных клубаў. Гамяльчане, напрыклад, прывезлі з вёскі ўсяго чатыры нумары, магіляўчане — усяго тры, а брэстчане і віцябляне не прадставілі вясковай самадзейнасці ні адным нумарам! Уяўляеце? Цэлыя дзве вобласці — дзве аграмністыя вобласці! — не прывезлі на Дэкаду ніводнага ўдзельніка вясковай самадзейнасці! Гэта ўжо трэба ўмець!.. Зявіліся таленты ў нашых вёсках? Няма больш там ні спевакоў, ні музыкаў, ні танцораў, ні дэкламатараў? А можа ўсё-такі ёсць? Можа проста з імі не працуюць, не рыхтуюць да аглядаў, не цікавяцца імі, не памагаюць ім? А можа і яшчэ адна прычына ёсць? Можа некаторыя адказныя работнікі раённых дамоў культуры лічаць, што чым пасылаць на агляд даярак Зосю ды Параску з іх дапатопнай «Рэчанькай», дык лепш паеду я, Аграфена Неафітаўна, сама — з моднай песенькай; гэтак яно нават і лепш: і людзей пагляджу, і сябе пакажаш, і начальства можа ўвагу звярнуць.

Я, напэўна, не ўзбіўся б на такую «крамольную» думку, калі б у праграмах канцэртаў не стракацелі так часта тытулы выканаўцаў: мастацкі кіраўнік РДК, інструктар РДК, кіраўнік калектыву, работніца клуба і г. д. Адным словам, самадзейнасць з дыпломамі і на зарплаце. Канешне, не забаронена выступаць і кіраўнікам і інструктарам, але ж і вёсцы дайце дарогу!

Другая рэспубліканская Дэкада самадзейнага мастацтва БССР пацвердзіла, што таленавітых самародкаў у нашым народзе — лічана-нязлічана, толькі іх трэба смялей выяўляць і падтрымліваць, умела і дбайна кіраваць выхаваннем іх густу, клапаціцца аб павышэнні іх выканаўчага майстэрства.

У нашай рэспубліцы ёсць нямала выдатных дзеячоў нацыянальнай культуры, нястомных энтузіястаў любімай справы, якія аддаюць развіццю самадзейнасці ўсе свае сілы і здольнасці. Назаву толькі некаторых: А. Чопчыц — мастацкі кіраўнік Гродзенскага народнага ансамбля песні і танца, Л. Ляшэнка — балетмайстар гэтага ж ансамбля, А. Валынчык — мастацкі кіраўнік хору калгаса «Гігант» Лідскага раёна, А. Дзяруга — мастацкі кіраўнік цымбальнага аркестра Смаргонскага РДК, заслужаны дзеяч культуры БССР П. Касач — кіраўнік хору вёскі Лявонавічы Нясвіжскага раёна, Е. Абабурка — кіраўнік хору вёскі Морач гэтага ж раёна, М. Жук — кіраўнік хору калгаса імя Леніна Ляхавіцкага раёна, І. Казелька — кіраўнік хору Мазырскага гарадскога Дома культуры, М. Бяспалаў — кіраўнік народнага хору Тураўскага Дома культуры, Я. Нікіцін — кіраўнік цымбальнага аркестра Палаца культуры мясцовай прамысловасці г. Віцебска, В. Раговіч — кіраўнік харавой капэлы Дома культуры Мінскага трактарнага завода, заслужаны дзеяч культуры БССР С. Грабеншчыкаў — кіраўнік народнага ансамбля танца Беларускага політэхнічнага інстытута і іншыя.

Хацелася б сказаць шмат цёплых слоў і ў адрас цэлых мастацкіх калектываў, і асобных выканаўцаў — удзельнікаў Дэкады, і ў адрас мастакоў (такіх, як, напрыклад, Л. Баразна з Гродна), — але зрабіць гэта не дазваляюць памеры газетнага артыкула. Ды і мэту я ставіў іншую — пагаварыць галоўным чынам аб рэпертуары нашай самадзейнасці, звярнуць увагу на тое становішча, сапраўды мастацкае, што забяспечыла выдатны поспех адным, і на тыя недахопы, памылкі і няўдачы, якія значна прынізілі поспехі другіх. Буду вельмі рады, калі мае заўвагі і меркаванні прынясуць хоць кроплю карысці дзеля нашай агульнай вялікай справы — новага ўздыму і росквіту самадзейнага мастацтва ў Беларусі.

«Дзявочы карагод» выконваюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці вёскі Цімкавічы Капыльскага раёна. Фота Ул. КРУКА.

ПРАПАГАНДА ВЕДАЎ ПА МАСТАЦТВУ

Універсітэты культуры, клубы, школы, навучальныя ўстановы — вось аўдыторыі, дзе часта выступаюць навуковыя супрацоўнікі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Яны шырока прапагандуюць мастацтва сярод насельніцтва, выязджаюць з лекцыямі ў аддаленыя раёны рэспублікі. Так, у Крывічах Мядзельскага раёна для слухачоў універсітэта культуры прачытала лекцыю «Віды і жанры выяўленчага мастацтва» Л. Любошыц. Перад студэнтамі навагрудскага тэхнікума гандлю з лекцыяй аб прыкладным мастацтве выступіла Т. Сцёпіна. Слухачы народнага універсітэта г. Вілейкі пазнаёміліся з асноўнымі этапамі савецкага мастацтва. Гэта тэма лекцыі Т. Карповіч.

Навуковыя супрацоўнікі Мастацкага музея Н. Бараноўская, Э. Вецер, А. Наркевіч, Н. Марчанка і іншыя толькі за мінулы месяц прачыталі каля сарака лекцый па мастацтву для рабочых, калгаснікаў, вучняў.

М. УСЦІНАЎ.

КАНЦЭРТЫ І ЛЕКЦЫІ ДЛЯ КАЛГАСНІКАЎ

Выкладчыкі і студэнты Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі — частыя госці ў калгаснікаў Пухавіцкага раёна. Яны дапамагаюць клубным работнікам праводзіць дыспуты па кнігах, чытаюць лекцыі на грамадска-палітычныя тэмы, выступаюць з дакладамі і гутаркамі сярод насельніцтва, аказваюць метадычную дапамогу сельскім калектывам мастацкай самадзейнасці. За апошні час для калгаснікаў сельгасарцелі імя М. І. Калініна і «Авангард» прачытаны лекцыі «Маральны кодэкс будаўніка камунізма», «Праграма КПСС аб далейшым уздыме культурнага ўзроўню савецкага народа» і іншыя. Калектыў мастацкай самадзейнасці кансерваторыі даў некалькі канцэртаў для калгаснікаў.

Па ініцыятыве калектыву кансерваторыі праведзен таксама вечар моладзі двух калгасаў сумесна са студэнтамі кансерваторыі.

Ул. КАРПОВІЧ.

«Перад вячэрай» — так называецца спектакль па п'есе В. Розава, які паставіў Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. На нашым здымку — сцэна са спектакля. У ролях: Валяр'яна — артыст М. Федароўскі, Верачкі — артыстка М. Захарэвіч, Ганны Іванаўны — артыстка Р Кашэльнікава.

Фота УЛ. КРУКА.

ЦЫМБАЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

Музычныя школы нашай рэспублікі кожны год набіраюць навучэнцаў па класу цымбалаў. Але вучыць дзяцей ігры на нацыянальным беларускім інструменце няма амаль ніякай магчымасці, бо ў продажы гэтыя інструменты бываюць вельмі рэдка. Калі ж дырэктары школ даюць заяўкі ва ўпраўленні культуры, дык з гэтага таксама нічога не атрымліваецца. У чым жа справа? Чаму, маючы ў рэспубліцы сваю музычную фабрыку, так цяжка забяспечыць музычныя школы і ўсіх тых, хто мае патрэбу ў беларускім інструменце?

На імя Галоўснаба Міністэрства культуры БССР паступаюць пісьмы і з іншых рэспублік з просьбай выслаць ці параіць, дзе можна набыць наш нацыянальны інструмент — цымбалы. Яшчэ ў красавіку 1961 года Галоўснаб Міністэрства культуры даў Барысаўскай фабрыцы піяніна заказ на выраб 50 камплектаў цымбалаў, але і па сённяшні дзень гэты заказ не рэалізаваны.

Асабіста я шмат разоў звяртаўся да старшага інжынера Галоўснаба І. Рубіна з пытаннем, ці не паступілі на базу цымбалы. Бо бацькі мне прахо-ду не даюць, пытаюцца, калі атрымаем інструменты. Але ўсё, як кажуць, дарэмна.

Неяк у кастрычніку леташняга года мы паехалі разам з тав. Рубіным проста на Барысаўскую фабрыку. Прыняў нас сам дырэктар М. Вайткевіч, і даволі ветліва. «Ведаю,— гаворыць, — становішча цяжкае, але што мы можам зрабіць — у нас няма басовых струн. Вось прывязуць гэтымі днямі, і мы хутка выканаем ваш заказ». Але дарэмна! І па сённяшні дзень няма абяцаных інструментаў. Як жа займацца з вучнямі, калі яны не маюць музычных інструментаў, каб практыкавацца дома і развіваць тэхніку ігры?

Я ўпэўнены, што не аднаго мяне турбуе гэтая складаная «цымбальная» праблема, што ўсе дырэктары музычных школ рэспублікі заклапочаны ёю.

Пара Саўнаргасу БССР даць указанне Барысаўскай фабрыцы, каб яна тэрмінова занялася выпускам цымбалаў і ў далейшым наладзіла сістэматычны выраб гэтага нацыянальнага інструмента.

В. КУНІЦКІ,
дырэктар музычнай школы № 4.

ТАЛЕНТ—ГЭТА ЯШЧЭ НЕ ЎСЁ!

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

Няўжо гэтак пішуць усе тыя, каго М. Стральцоў назваў у ліку прыхільнікаў і практыкаў «новага стылю»? Няўжо нешта падобнае вычытаў А. Кулакоўскі ў «Людзях на балоце» І. Мележа — творы, па вызначэнню таго ж М. Стральцова, «сучасным па думках **і па мове**»?

Было б несур'ёзна выказваць здагадку, што А. Кулакоўскі не чытаў, напрыклад, аповесцей Васіля Быкава, але зразумела, што ён не пажадаў заўважаць у іх таго новага і плённага, што знойдзена не толькі талентам маладога празаіка, але і калектыўнымі пошукамі, якім паклалі пачатак «Звязда» і «Двое ў стэпе» Э. Казакевіча, «У окопах Сталинграда» В. Някрасава.

Нельга не згадзіцца з самой пастаноўкай пытання ў артыкуле А. Кулакоўскага: «Перш за ўсё — талент!» Аднак нельга адмаўляць і ролі калектыўных намаганняў, якія ў пазнейшым спалучэнні, сінтэзе могуць і павінны даць новую якасць. Перафразіраваўшы тэзіс А. Кулакоўскага, трэба дадаць да яго: «Талент — гэта яшчэ не ўсё!»

Паспрабуем больш дакладна абгрунтаваць гэтую думку.

Сучасны па гучанню, па ідэйнай напоўненасці раман І. Мележа «Людзі на балоце» **наўрад ці** можна назваць да канца **наватарскім** па стылю. Нам здаецца, што больш падстаў мае меркаванне Я. Герцовіча («Пераклічка эпох», ЛІМ, 27 лістапада 1962 г.), які лічыць «Людзей на балоце» «...найлепшым доказам таго, што нельга адмаўляць ролю мастацкіх сродкаў уздзеяння на чытача толькі таму, што яны адкрыты і выпрабаваны ўчора, а не сёння».

Больш таго, у рамане, наогул аналітычным, аддадзена пэўная даніна апісальнасці; аўтарская мова, у цэлым вельмі арганічная і тактоўна прыўзнятая над мовай персанажаў, часам вяртаецца ў палон фальклорнай традыцыі, і тады мы чытаем такія, напрыклад, радкі:

«Галасок яе быў нясмелы, кволы — здавалася, ён, лагодны, задуменна-журботны, **з недарэчнай скаргай-крыўдай** вось-вось патоне ў выбуху рогату, але хвіля за хвіляй ішлі, а ён не тануў. Ён, праўда, і не мацнеў, нейкі час усе маўчалі, як бы **слухалі-чакалі**, як бы не ведалі, **не здагадваліся**, пра што **шумелі-жаліліся** вербы».

Усё гэта так, і тым не менш цяжка сабе ўявіць эпічнае палатно аб жыцці палескай вёскі 20-х гадоў, якое б па стылю **істотна** адрознівалася ад рамана І. Мележа — настолькі стылявыя сродкі адпавядаюць тут аўтарскай задуме і, галоўнае, **жыццёваму** матэрыялу, які дыктаваў менавіта такое мастацкае вырашэнне тэмы.

Дык няўжо Аляксей Кулакоўскі лічыць, што гэтым твор абавязаны **толькі** таленту свайго аўтара, што тут ні пры чым вопыт папярэднікаў Платона Галавача і Міхася Зарэцкага, Кузьмы Чорнага і Аркадзя Чарнышэвіча ды і яшчэ многіх больш і менш таленавітых пісьменнікаў?

Дакладна прадуманая кампазіцыя, майстэрскі дасканалыя характарыстыкі персанажаў, надзвычай дакладная і багатая народная мова — усё гэта ёсць у рамане І. Мележа, але ёсць як удалы сінтэз папярэдніх здабыткаў літаратуры.

А чаму тады не ўявіць, што сённяшнія творы Ю. Бондарава, Г. Бакланава або В. Быкава з'явяцца папярэднікамі новай «Вайны і міру»? Магчыма, гэта будзе досыць традыцыйнае шматпланавае мастацкае даследаванне, асноўныя рысы якога вызначаны дылогіяй К. Сіманава. Можа, тое, што зараз робіць у нас А. Адамовіч, ляжа грунтоўным укладам у гэтую скарбонку. А што, калі той жа В. Быкаў ужо выношвае задуму твора, які, абагуліўшы ўвесь плён сучаснага наватарства, зойме такое ж месца ў гісторыі літаратуры, якое займае сусветна вядомая эпапея Льва Талстога?

Вось чаму нельга адмахвацца, як гэта атрымалася ў А. Кулакоўскага, ад таго, што зроблена і робіцца наватарамі. Лепш разам з мільёнамі чытачоў парадавацца, што нашая літаратура з кожным годам узбагачаецца агульнымі намаганнямі «традыцыяналістаў» і «наватараў».

Якія ж агульныя рысы ўласцівы стылю наватарскіх твораў сучаснай прозы? Іх вельмі цяжка вылучыць і раскласці па палічках, тым больш, што мы маем справу з калектыўным адкрываннем, што нельга, бадай, назваць празаіка, у творчасці якога спалучаліся б **усе** прыёмы, знойдзеныя на гэтым шляху. Паэзія і асабліва яе найбольш актыўны атрад — лірыкі — далёка апярэдзілі прозу як у практыцы, так і ў тэарэтычным абагульненні зробленага.

І тым не менш, у беларускай прозе апошніх год нельга не заўважыць актыўных пошукаў новага, якія, на наш погляд, найбольшы плён далі ў ваеннай тэме. Гэта і зразумела, калі ўлічыць, што нашы майстры буйных празаічных жанраў вельмі неахвотна звяртаюцца да тэм і праблем, высунутых жыццём у самы апошні час. Так званая «калгасная» тэма, якая распрацавана ў нас не менш, чым ваенная, не адчула на сабе **значнага** абнаўлення. І ўсё — чаму? На нашу думку, з-за супраціўлення шматгадовых традыцый. Бадай, таксама сказваецца тут зразумелая інерцыя матэрыялу: людзі, якія складаюць зараз найбольш дзейны атрад нашых празаікаў, лепш захоўваюць у памяці вопыт перадваеннага калгаснага будаўніцтва і вайны, а жыццё сяла пасля XX з'езда КПСС не стала аб'ектам іх уласнага, жыццёва неабходнага і працяглага вопыту. Тут нельга спадзявацца на т. зв. талент, тут трэба нібы ўпершыню асэнсаваць нешта адметнае, тое, што нараджаецца сёння, — хай сабе мы назавём гэта асэнсаванне традыцыйным або «наватарскім».

Асноўнай, найбольш агульнай прыкметай т. зв. «новага стылю» яго ўпартыя прыхільнікі лічаць лаканізм, прычым ён разумеецца не толькі і не столькі як цяга да малых форм, а як гранічнае напаўненне формы зместам. І добра, калі мастак імкнецца скупымі, эканомнымі сродкамі дасягнуць максімальнага ўздзеяння на чытача.

Не сакрэт, што лаканізм у гэтым сэнсе—адвечны, нават амаль біялагічны закон мастацтва, а калі разумець яго больш шырока і крыху фігуральна — то і ўсёй свядомай чалавечай дзейнасці. Творца «Іліяды» і «Адысеі», мабыць, ахвотна ахвяраваў бы палованю сваіх гекзаметраў, калі б ведаў, што ад гэтага ніколькі не пацерпіць змест: легендарнага Гамера вымушаў да нястрымнага красамоўства ўзровень мыслення старажытных грэкаў, абмежаваная колькасць у мове слоў-паняццяў, змест якіх даводзілася перадаваць апісальна, праз шматлікія метафары і параўнанні.

Не толькі ў літаратуры — у штодзённым жыцці мы чуем патрабаванне: «Гавары карацей!» Імкненне да лаканічнасці таму і ўласціва кожнаму мастаку, калі яго пяром, разцом або кісцю, зразумела, кіруюць не ганарарныя меркаванні. Бо гэта ўжо — халтура!

Выдатныя і, шчыра кажучы, неперазыйдзеныя ўзоры лаканічнай і празрыстай прозы — Пушкін, Лермантаў, Чэхаў. Прыклады сціслай мастацкай мовы далі ў нашай літаратуры, скажам, М. Багдановіч і Зм. Бядуля, **празаічныя творы якіх нагадваюць то вершы-паданні ў прозе, то абразкі жыцця...** Усё гэта ішло ад складу мастацкага мыслення і разумення пісьменнікам той рэчаіснасці, якую ён адлюстроўваў. Ці ж «Тамань» або «Дама з сабачкам» (або яшчэ Багдановічаў «Музыка») не маглі быць разгорнуты ў аповесць і нават у раман у сённяшнім сэнсе гэтых слоў-тэрмінаў, калі б у Лермантава, Чэхава і Багдановіча **брала перавагу што-небудзь адно: талент ці** светаўспрыняцце, жыццёвы погляд на рэчаіснасць? Тое і іншае павінны быць гранічна суладнымі. Таму мы яшчэ раз і адносна лаканізму сцвярджаем: «Талент — гэта яшчэ не ўсё!»

Пытанне ў тым, **як** лаканізм **рэалізуецца** ў мастацкай творчай практыцы. Успомнім першыя буйныя празаічныя творы аб Айчыннай вайне: «У агні» І. Гурскага, «Згуртаванасць» М. Ткачова, «Мінскі напрамак» І. Мележа, нарэшце, «Векапомныя дні» М. Лынькова. Не адмаўляючы ім і сёння ў пэўнай сучаснасці гучання, у значнай выхаваўчай сіле, нельга не заўважыць: шмат што ў іх зрабілася для сённяшняга чытача не больш, як дакументальнымі звесткамі, накшталт тых данясенняў і рэляцый, што захоўваюцца недзе ў ваенных архівах. І гэтае **«шмат што»** абавязкова звязана з апісальнасцю, з падменай мастацкага пранікнення ў глыбіню з'явы звычайнай канстатацыяй. Калі ў цэнтры ўвагі застаецца толькі падзея, дык губляецца чалавек з яго складаным эмацыянальным і інтэлектуальным светам. Велічыню страты ад гэтага цяжка перабольшыць, калі памятаць, што літаратура — гэта чалавеказнаўства.

Тут няма папроку: апісальнасць, якую той або іншы аўтар памылкова разумее як мастацкае адлюстраванне жыцця, — лёс амаль усіх твораў, якія пішуцца паспешліва, па т. зв. гарачых слядах падзей. Паспешлівасць і аператыўнасць — з'явы ў мастацтве розныя.

Побач з апісальнасцю, можа, крыху абганяючы яе, ідзе ілюстрацыйнасць: думка не вынікае з апісанай падзеі натуральна, сама па сабе, а штучна дадаецца звонку.

Гранічнае напаўненне формы зместам робіцца магчымым, дзякуючы **ўзмоцненаму аналітызму** сучаснай прозы, калі думка аўтара не брыдзе ўслед за падзеяй, а сама арганізуе яе, каб потым прыйсці да чытача канкрэтнай і выразнай.

Лёшка Задарожны (з «Трэцяй ракеты» В. Быкава), які праводзіў у тыл з агнявой пазіцыі санінструктара Люсю, вярнуўшыся, выхваляецца сваёй, можа і выдуманай, перамогай: «Капітуляцыя. Была Люська і кокнула! Законна!»

Можна проста заўважыць гэты эпізод з большай ці меншай дозай асуджэння, можна сказаць, што, маўляў, на вайне ўсякае бывае.

А можна і інакш...

Люся — адзіная дзяўчына, якую кожны дзень могуць бачыць байцы, дзяўчына незвычайная ўжо тым, што яна тут, побач з імі, у гэтым пекле. Кожны з разліку адчувае да яе нешта сваё, чыстае, але большае за простую прыхільнасць. Задарожны не паслухаўся наводчыка Папова, пайшоў з Люсяй у тыл, давялося без яго капаць сховішча для гарматы... Для кожнага з шасці салдат заўтрашні дзень можа стаць апошнім... Усё гэта разам выклікае ў Лазняку—Лазняк у аповесці гэта аўтарскае «я» — магутны эмацыянальны выбух: ён кідаецца на Задарожнага з кулакамі. Пазней, усвядоміўшы сваё **маральнае** права быць суддзёй, ён стрэліць у твар Задарожнаму з ракетніцы, але прыведзены вышэй, знешне такі нязначны — у параўнанні з іншымі —эпізод па драматызму, па інтэлектуальнаму напаўненню амаль не саступае фіналу, бо тут таксама адбылася схватка **за** чалавека ў **чалавеку**.

Такое ўменне па-мастацку **падпарадкаваць падзею** аўтарскай **задуме** і ёсць сапраўдны **аналітызм**.

Можна было і не прыводзіць гэтага прыкладу, бо аповесць В. Быкава да канца вытрымана ў аналітычным стылі. Ды і наогул адыход ад апісальніцтва найбольш прыкметны працэс у прозе нашых дзён.

Наўрад ці хто будзе аспрэчваць, што не толькі буйным раманам, але і невялікім па памерах аповесцям першых пасляваенных год часта была ўласціва неакрэсленасць задумы, намаганне сказаць усё аб усім. Адсюль — раскіданасць дзеяння, шматперсанажнасць.

Ёсць гэта, напрыклад, у аповесцях Ул. Шахаўца «Землякі» і «Насустрач». У апошняй сваёй кнізе «Чорны снег» ён творча спыняе ўвагу на адным эпізодзе з жыцця юнака-разведчыка Сяргея Бярозкі. І задуму аўтар вызначыў для сябе дакладна і канкрэтна — паказаць маральную перавагу простага сялянскага хлопца перад нямецкім пісьменнікам Гансам Лемке, які змагаецца супраць партызан у мундзіры «оберста» і нават пад новым прозвішчам — фон Крубер. Гэта — змест і нават мэта творчых пошукаў літаратара, які дакладна ведае тое, што ён бачыў у жыцці... Аднак тое жыццё, якое кожны з нас ведае і спрабуе па-мастацку асэнсаваць,—яно раскіданае, хаатычнае. Калі не ўстрымацца ад апісальніцтва, дык атрымаецца прыблізная мастацкая праўда жыцця, павярхоўнае меркаванне аб тым, што ты бачыў. Атрымаецца «традыцыйны» твор, у горшым сэнсе слова.

А дзеянне ў «Трэцяй ракеце» адбываецца на працягу адных сутак. Яно амаль не выходзіць за межы акопчыка, нават не аддаляецца ад гарматы, якая звязала лёс герояў аповесці. Персанажаў тут, праўда, некалькі, але зноў жа над усімі імі стаіць абагульняючая фігура Лазняка—аўтарскае «я». З дапамогай такога прыёму В. Быкаў імкнецца па-мастацку асэнсаваць бачанае ў жыцці.

У гранічным абмежаванні дзеяння ў часе, у геаграфіі, у сканцэнтраванасці яго вакол аднаго асобнага эпізода, аднаго ці невялікай колькасці персанажаў, — ва ўсім аўтар рэалізуе сучасныя патрабаванні лаканізму.

А што можа адбыцца ў невялікім акопчыку за **дваццаць чатыры гадзіны?**

Можна пагаварыць аб надвор'і, паганяць «акупантаў» у бялізне, нарэшце, як след выспацца — салдат спіць, а служба ідзе.

А можа адбыцца і нешта такое, што дасць герою маральнае права стрэліць ракетаю ў твар свайго ўчарашняга сябра, дасць пісьменніку права на вялікія абагульненні, прымусіць чытача надоўга задумацца аб тым, наколькі жывучы ў чалавеку чалавек.

Ніхто з узводу лейтэнанта Траўкіна **не вярнуўся** жывым з варожага тылу. («Звязда»).

Двое — трагічна асуджаны на смерць афіцэр сувязі і яго канваір — блукаюць па стэпе, уступаюць у бойку з фашыстамі («Двое ў стэпе»).

За дваццаць чатыры гадзіны **гінуць** усе баявыя таварышы Лазняка, дарагая яму дзяўчына і, нарэшце, — ад яго рукі — учарашні таварыш, а сёння нікчэмны баязлівец, амаль здраднік («Трэцяя ракета»).

На такія гранічна вострыя, напружаныя сітуацыі дае права сучаснае разуменне лаканізму. Пісьменнік не клапоціцца аб тым, што ў жыцці настолькі драматычныя абставіны, праўда, складаюцца, але не кожны дзень, яны досыць рэдкія. Важна, аднак, не знешняе падабенства да штодзённага жыцця, а глыбінны ўваход у свядомасць, у душу чалавека якраз у той час, калі ўсё ў чалавеку раскрываецца асабліва поўна і выразна. Вось гэта і ёсць лаканізм, які дапамагае В. Быкаву надзвычай скупымі і дакладнымі сродкамі абмаляваць сваіх герояў: не дужа пісьменнага, але па-свойму вельмі разумнага Жаўтых, знешне стрыманага, грубаватага Крывёнка, інтэлігентнага Лук'янава, які пакутуе і не можа нават памерці спакойна ад усведамлення сваёй колішняй віны, і Люсю, і Задарожнага, і найбольш складаны і ёмісты вобраз Лазняка.

Дваццаць чатыры гадзіны... А героі В. Быкава **не толькі** ваююць і паміраюць — яны яшчэ і філасофствуюць.

Па-свойму філасофствуе Жаўтых, гаворачы пра Люсю:

«— На добрай зямлі вырасла. У добры час. Што вы думаеце: ад зямлі ўсё. І чалавек. Якая зямля — такі чалавек».

Па-свойму, больш практычна, філасофствуе салдат Папоў:

«— Адын салдат, шыбка смелы салдат, танк падбівай — маладзец салдат! Другі салдат, малаа смелы салдат, немца страляй — два раз маладэц салдат».

Надзвычай глыбока, выказваючы галоўную думку твора, філасофствуе Люся:

«Іншы **перажывае**: медалем не ўзнагародзілі! Іншы імкнецца як спрытней пахваліцца сілай, пабораць каго ці яшчэ як сябе паказаць. А таго вы не разумееце, што недзе ў кожнага з вас маці, ну ці там дзяўчына і што вы дарагія ім зусім не гэтым. Ім гэта зусім не патрэбна. Ды і няважна гэта. Важна душа ў чалавеку: каб ён быў сумленны, адданы, таварыскі, праўдзівы. Гэта ж найпершае ў чалавеку. Сіла ад прыроды дадзена, яе не зменіш. Збаяцца чалавек можа і насуперак сабе, а ашукаць каго дзеля карысці сабе — не. Калі ён чысты душой, ніколі не ашукае».

Амаль усе героі твора, не гаворачы аб Лазняку, дзеляцца сваім роздумам аб жыцці, фармулююць яго ў значных важкіх фразах. У іншых абставінах гэта б прагучала фальшыва, ненатуральна. Але тут, перад тварам смерці, ні на момант не ўзнікае адчуванне штучнасці гэтай вельмі канкрэтнай філасофіі.

Ці ж гэта не доказ, што аўтарская задума патрабавала іменна такой, выключнай жыццёвай сітуацыі?

У «Чорным снезе» Ул. Шахаўца ёсць такі эпізод. Сяргей Бярозка ідзе на заданне. Ад яго поспеху залежыць лёс блакіраванай у пушчы партызанскай брыгады, лёс соцень сяброў.

«Страляць толькі ў самым крайнім выпадку»,— наказ камандзіра. Недалёка ад размяшчэння гітлераўцаў, праз якое Сяргею абавязкова трэба непрыкметна прабрацца, хлопец заўважае зграю ваўкоў. Вось-вось драпежнікі накінуцца на яго... Выручыць можа адна-адзіная чарга з аўтамата, але тады разведчык выдасць сябе — ворагі пабач. І аўтамат Сяргея маўчыць да канца.

Вось дзе сітуацыя выдатна **працуе на характар!** І дарэмна аўтар апраўдваецца, што такі выпадак быў, можа, адзін за ўсю гісторыю партызанскай вайны.

С. Прошын у рамане «Я забыў аб цішыні» таксама лічыць патрэбным загадзя апраўдацца перад чытачом і крытыкай за тое, што фактычна завязкай для ўсяго **твора** ўзяў незвычайную, «рызыкоўную» сітуацыю.

«— Выключнае становішча, як у рамане», — гаворыць Вадзім Мінковіч Фрыцу Шварцу. У гарачцы рукапашнай сутычкі яны абодва незнарок уляцелі ў сіласную яму і былі вымушаны праседзець так сам-насам больш за суткі.

Вельмі ўдзячная сітуацыя, і аўтар у далейшым удала скарыстоўвае яе, а ўсякія апраўданні тут — «як у рамане» — анахранізм.

Можна б прасачыць яшчэ элементы т. зв. «сучаснага стылю» ў апавяданнях нашых празаікаў, скажам, І. Навуменкі або М. Лупсякова, спыніцца на тым, як некаторыя пісьменнікі скарыстоўваюць падтэкст; можна на прыкладзе таго ж В. Быкава разгледзець, якія часам мае перавагі «споведзь» перад «пропаведдзю», але гэта ўжо, думаецца, тэма асобнага артыкула.

Мне толькі хацелася давесці, што і наша проза паварочваецца тварам да «сучаснага стылю», што гэта прыносіць свой плён: наватарская «Трэцяя ракета» займае зараз **такое ж** месца ў прозе ваеннай тэмы, якое і куды больш традыцыйныя «Людзі на балоце» — у асвятленні жыцця вёскі першых паслякастрычніцкіх год.

І таму мы — **за пошукі.** А талент — гэта, вядома, добра. Асабліва, калі шчаслівы ўладальнік яго з павагай і аб'ектыўна адносіцца да іншых талентаў.

Нашы інтэрв'ю

БЕЛАРУСКАЯ ПУШНІНА

Пахадзіце з гадзінку па прыгожых зімовых вуліцах, паназірайце за адзеннем гараджан, і вы атрымаеце аб ёй поўнае уяўленне. Колькі за апошні час паявілася ярніх штучных футраў, а нашы куніца і выдра, тхарок і гарнастай, нават крот і ліс іца ўсё не выходзяць з моды.

Прасторна на Беларусі пушному звеpу! Які ж ён у наш час, беларускі лясны промысел?

РАСЦЕ БАБРОВАГ ПАГАЛОЎЕ

У Беларускім аддзяленні Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута жывёльнай сыравіны і пушніны вядзецца строгі ўлік усяго ляснога насельніцтва рэспублікі.

За апошнія гады, расказваюць нам, на тэрыторыі Беларусі здабывалася дваццаць відаў пушных звяроў. Сярод іх на першым месцы стаяць рудая ліс іца, крот, заяц-русак, тхор, вавёрка...

— Але калі гаварыць пра беларускую пушніну, — папраўляе старшы навуковы супрацоўнік З. Г. Самусенка, — дык пачынаць трэба з бабра. Беларусь — адзін з нямногіх раёнаў, дзе гэты найкаштоўнейшы пушны звер захаваўся ў натуральных умовах. Прычым, мы маем палавіну саюзных запасаў.

Наша зямля была некалі сапраўдным «бабровым царствам». Зірніце на карту, звярніце ўвагу на назвы беларускіх гарадоў, рэк азёр. Вы знойдзеце раку Бобр, станцыю Бобр, возера Бабравіцкае, нават два прытокі Прыпяці пад назваю Бобрык. Я ўжо не гавару пра горад Бабруйск. Усё гэта не выпадкова. Беларусь пастаўляла прыгожую і моцную бабровую футру ў многія краіны Еўропы.

Але драпежніцкае вынішчэнне каштоўнага звера вяло да скарачэння яго колькасці. К канцу першай сусветнай вайны бабры амаль зваяліся. І толькі вялікія мерапрыемствы па ахове прыроды, якія пачалі ажыццяўляцца з першых жа дзён Савецкай улады, дазволілі аднавіць бабровае пагалоўе. Цяпер мы можам гаварыць не толькі аб аднаўленні прамысловых запасаў, але і аб неабходнасці планамернага адлову бабра. Справа ў тым, што ў выніку прынятых мер бабры пачалі хутка пладзіцца. Вадзянога звярка можна сустрэць цяпер нават у ваколіцах такіх гарадоў, як Гродна, Гомель, Віцебск. Павелічэнне бабрыных статкаў у адных месцах вядзе да таго, што спустошваюцца запасы корму, а гэта выклікае замаруджванне і спыненне прыросту.

Біёлагі і паляўнічтвазнаўцы абмяркоўваюць цяпер пытанне аб адмене забароны промысла бабра, аб далейшым яго расяленні ў яшчэ не асвоеных раёнах. Бо толькі за кошт запаволення прыросту траціцца штогод каля паўтары-дзве тысячы каштоўных шкурак.

СЕМ ТЫСЯЧ ПАЦУКОЎ НА АДНЫМ КІЛАМЕТРЫ

Мы просім расказаць пра іншых прадстаўнікоў пушной фауны рэспублікі.

— Па якасці футры,— гаворыць Эдуард Рыгоравіч, — побач з бабром могуць быць пастаўлены толькі выдра і куніца. Выдра, як і бабёр, была ў нас амаль цалкам вынішчана. Да вайны яна не адлоўлівалася. Пасля вайны ў асобныя гады нарыхтоўвалася па пяць тысяч і больш шкурак. Асабліва многа здавалася на нарыхтоўчыя пункты шкурак куніцы. А вось за апошнія гады адлоў прыкметна зменшыўся. Змяншаецца таксама здабыча тхара, вадзянога пацука, крата. Справа тут не ў спустошэнні запасаў, усё тлумачыцца куды больш проста. Для адлову выдры, тхара, вадзянога пацука, крата неабходны пасткі. Завозяцца яны ў рэспубліку ў дастатковай колькасці, але да паляўнічых не даходзяць. Ёсць сігналы, што некаторыя райспажыўсаюзы накладаюць на пасткі «падатак»: здасі яйкі ці воўну, атрымаеш сродкі лову. Сям-там пасткі гадамі праляжваюць на базах. У Віцебскай вобласці, напрыклад, асела на базах больш дваццаці тысяч пастак.

Да чаго гэта прыводзіць відаць на прыкладзе з адловам вадзянога пацука. Шкурка звярка не вельмі каштоўная, яна ідзе на шапкі, дзіцячыя футры, выраб фетру і замшы. Але вадзяны пацук — небяспечны сельскагаспадарчы шкоднік. Пражорлівы звярок з'ядае штодзённа 50 працэнтаў таго, што важыць сам. У Пінскім, Любанскім, Бярозаўскім раёнах пацукі летась нанеслі вялікую шкоду агародам, бульбяным палям, пасевам азімых. Мы зрабілі такі эксперымент. Ля ракі выбралі ўчастак, заселены вадзянымі пацукамі, і падлічылі колькасць звяркоў, вылаўленых на квадратным кіламетры. У пасткі трапіла каля сямі тысяч пацукоў. Пры сутачнай норме ў сто грамаў яны знішчалі штодзённа сем цэнтнераў зялёнай масы. Не дзіўна, што берагі рэк у раёнах пасялення вадзяных пацукоў выглядаюць аголенымі. Пацукі хутка размнажаюцца і могуць стаць сапраўдным бедствам для палёў. Неабходна ўсяляк заахвочваць іх адлоў. А пасткі ляжаць на складах... Вось і атрымліваецца, што ў Гомельскай вобласці, дзе да вайны нарыхтоўвалася 300 тысяч шкурак вадзянога пацука, зараз не нарыхтавана ніводнай. Вінаватыя тут не толькі нарыхтоўшчыкі. Да гэтага часу не выпушчана ніводнай лістоўкі, плаката, брашуры, у якіх апісваліся б спосабы вылоўлівання пасткамі. А каб паляваць на вадзянога пацука ці крата нават не трэба быць членам саюза паляўнічых. Да гэтай справы можна прыцягнуць школьнікаў, калгасную моладзь.

РОЗНЫЯ БЫВАЮЦЬ ПАЛЯЎНІЧЫЯ...

— Эдуард Рыгоравіч,— пытаемся мы, — калі ўжо гаворка зайшла пра паляўнічых, — скажыце, колькі іх у нас?

— Усяго па рэспубліцы зарэгістравана 70 тысяч паляўнічых. Лічба, як бачыце, немалая. Але, на жаль, прафесіяналаў сярод іх нямнога. А гэта адбіваецца і на адлове, і на здачы пушной сыравіны. Усё яшчэ частыя выпадкі браканьерства, драпежніцкага вынішчэння маладняку, псавання ці неразумнага выкарыстання пушніны. Вазьміце паляванне на зайца. Штогод на нарыхтоўчыя пункты паступае сто тысяч шкурак, а адстрэл, па нашых дадзеных, значна перавышае гэтую лічбу. Справа ў тым, што паляўнічыя, якія прамышляюць дзеля «спартыўнай забавы», не лічаць патрэбным здаваць шкурку. У выніку мы трацім каштоўную сыравіну.

Найбольшую колькасць браканьерскіх стрэлаў робяць «аматары», людзі, для якіх паляванне — забава. Толькі за год было зарэгістравана 67 выпадкаў знішчэння ласёў, такога рэдкага цяпер у нашых краях жыхара лясоў. Браканьеры палююць і на мядзведзя — звера, які зараз знаходзіцца ў нас пад поўнай аховай.

Пытанні аховы пушной фауны, барацьбы з браканьерствам і вынішчэннем маладняку з'яўляюцца часткай агульнай барацьбы за ахову прыродных багаццяў рэспублікі, аднаўленне і пашырэнне яе жывёльнага свету.

НА ПАСТАЯННАЕ ЖЫХАРСТВА

Тут наша размова перайшла да мерапрыемстваў па акліматызацыі ў Беларусі новых пушных звяроў.

Яшчэ ў 1936 годзе ў рэспубліку быў завезены янотападобны сабака. Звярок гэты — далёкаўсходні жыхар, але да нас трапіў з Варонежскага запаведніка. Рассяленне янотападобнага сабакі закончылася ў 1956 годзе, аднак ужо трыма гадамі раней стала магчымым пачаць яго адлоў. Цяпер янот дае да дзесяці працэнтаў кошту ўсёй беларускай пушніны, а ў Віцебскай вобласці, дзе яго асабліва многа, — да 25 працэнтаў. Янотападобны сабака знішчае многіх шкоднікаў сельскай і лясной гаспадаркі.

Другі наш госць — андатра. Паявілася яна ў Беларусі, як кажуць, з «чорнага ходу». У 1905 годзе андатра ўпершыню была прывезена з Амерыкі ў Еўропу і выпушчана паблізу Прагі. Да 1948 года праз Польшчу яна пранікла на тэрыторыю Украіны і Брэсцкай вобласці. Але тут далейшае распаўсюджванне звера спыніў водападзел басейнаў Нёмана, Буга і Дняпра. Андатра, як і бабёр, жыве на рэках. водападзел для яе — сур'ёзная перашкода. Вось чаму «самазасяленне» абмяжавалася басейнам Буга. У далейшым, аднак, гэты каштоўны пушны звер паляўнічтвазнаўцамі быў завезены ў Віцебскую і Гомельскую вобласці, цяпер яго пасяленне ёсць у многіх раёнах. Прыродныя ўмовы Беларусі выключна спрыяльныя для андатры. Пры паспяховым размнажэнні і адлове мы павялічым дзякуючы ёй нарыхтоўкі пушніны на 10—12 працэнтаў.

Але каштоўная не толькі футра андатры. Вельмі спажыўнае і смачнае яе мяса.

У рэспубліцы добра акліматызоўваюцца амерыканская норка і выхухаль. Але дзве гэтыя пароды нельга пасяляць разам. драпежная норка знішчае насякомаядную выхухаль. Нельга сказаць, каб гэтага не ведалі супрацоўнікі былога Упраўлення паляўнічай гаспадаркі і запаведнікаў, але выхухаль была выпушчана менавіта туды, дзе раней рассялілі норку. Вынікі не цяжка было прадбачыць. Цяпер выхухаль выпушчана ў прытоках Прыпяці і Пціны, у месцах, свабодных ад норкі, і можна чакаць, што размнажэнне яе пойдзе паспяхова.

Ужо ў самы апошні час на ўлік узяты янот-паласкун — звярок, новы не толькі для Беларусі, але і для Савецкага Саюза. Янот-паласкун яшчэ не адлоўліваўся намі, але па дадзеных інстытута, акліматызацыя працякае паспяхова. Гэта важны вынік, таму што ў лясной зоне паласкун выпускаецца ўпершыню. Падобны эксперымент быў прароблены толькі ў Сярэдняй Азіі і Закаўказзі.

— Хутка, гаворачы пра беларускія футры,— заканчвае Эдуард Рыгоравіч, — мы зможам назваць не толькі бабра, выдру, куніцу, але і андатру, норку, выхухаль, янота. Узрасце доля рэспублікі ў пушным балансе краіны.

М. МАРЦІНКОЎСКІ.

У Мінску адбыліся гастролі народнага артыста Армянскай ССР Артура Айдзіняна. Ён выканаў творы савецкіх, рускіх і заходніх кампазітараў. У канцэртах прынялі ўдзел дыпламант Усесаюзнага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў віяланчалістка Ксенія Юганава і піяніст Уладзімір Гладштэйн.

На здымку: спявае Артур Айдзінян.

Фота Ул. КРУКА.

ЛОЦМАНЫ КНІЖНАГА МОРА

Маладзечанскай гарадской бібліятэцы прысвоілі званне бібліятэкі выдатнай работы. На вечары, прысвечаным гэтай прыемнай для нас, чытачоў, падзеі, было шмат усмешак, кветак, шмат было сказана добрых слоў пра загадчыцу бібліятэкі Галіну Іванаўну Ляпіхіну і іншых работнікаў. А я ўспомніла, як шмат гадоў назад толькі нараджалася ў Маладзечна тое, чым цяпер па праву могуць ганарыцца работнікі гарадской бібліятэкі.

Сумна было ў свой час у бібліятэцы. Уся справа абмяжоўвалася выдачай кніг. Бібліятэкары вельмі нагадвалі прадаўцоў магазінаў за прылаўкам. «Атрымалі? Задаволены? Ну і бывайце здаровы!» Вось, уласна, і ўся работа. Афармляліся, вядома, кніжныя вітрыны, і канферэнцыі чытачоў час ад часу наладжваліся, але ўсё рабілася аднастайна, па шаблону. Галоўным жа па-ранейшаму заставалася праславутая «кнігавыдача». «Маладзечанская бібліятэка за справаздачны перыяд дасягнула вось такой колькасці кнігавыдач». Так пісалі, так гаварылі. Вінаваты былі не толькі бібліятэкары. На кнігавыдачу як на галоўны і адзіны паказчык работы бібліятэкара глядзелі і некаторыя былыя кіраўнікі культурнага фронту. Шмат кнігавыдач — пашана і павага загадчыку і ўсяму калектыву.

Віктар Дзяменцьеў працуе ўстаноўшчыкам на Барысаўскай фабрыцы піяніна. Малады рабочы штодзённа перавыконвае норму выпрацоўкі, якасць яго работы выдатная.

На здымку: камсамолец В. Дзяменцьеў устанаўлівае клавіятуру піяніна.

Фотахроніка БЕЛТА

Праўда былі і такія бібліятэкары, якія стараліся працаваць удумліва і сур'ёзна, ад душы: гутарылі з чытачамі аб прачытаных кнігах, вывучылі іх запатрабаванні. Гэта Аляксандра Грозная, Надзея Тузава, Аліна Яновіч, Люся Кабяк, Елізавета Шустэрман. Але адчувалася адсутнасць у калектыве сапраўднага кіраўніка, які б падтрымаў усё лепшае і скіраваў намаганні ўсяго калектыву да творчай працы, да пошукаў.

Такім кіраўніком і стала Галіна Іванаўна Ляпіхіна.

Вось што яна сама гаворыць пра свае першыя крокі на бібліятэчнай ніве.

— Прыняла я бібліятэку. І, шчыра кажучы, боязна стала. Такой адказнай справы мне не даводзілася выконваць за ўсё маё працоўнае жыццё.

Хіба гэта жарты: тысячы чытачоў прыходзяць па кнігі, і кожная кніга на іх нейкім чынам уплывае. Адна ўзнімае настрой, нараджае новыя думкі, абуджае жаданне працаваць, тварыць. Другая ж — толькі на сум наводзіць. Не кожны чытач можа самастойна разабрацца ў тысячах кніг, якія глядзяць на яго сваімі шматлікімі прывабнымі назвамі. Значыць, і падыход да чытачоў не можа быць аднолькавы. Што нам, бібліятэчным работнікам, трэба рабіць у першую чаргу? Вядома, вывучаць чытачоў, іх густы, запатрабаванні, працаваць з імі, выхоўваць. Таму бібліятэкар **абавязан ведаць літаратуру** куды лепш, чым сярэдні чытач. А інакш якая ж карысць ад бібліятэчнага работніка? Вось, напрыклад, пытаюць пра Юхана Смуула: што яшчэ напісаў ён, апроч «Лёдавай кнігі»? А што, на самай справе? Вершы, здаецца, п'есы... Вось і даводзіцца чырванець. Пойдзе чытач, а ты хуценька да каталога, корпаешся ў картках, пасылаеш запатрабаванні, вывучаеш творчасць пісьменніка, на якога, як іншы раз гавораць, «павысіўся попыт». Мінае тыдзень, другі, і ты ўжо ўпэўнена рэкамендуеш чытачам творы выдатнага пісьменніка, паэта і драматурга Юхана Смуула, з творчасцю якога знаёмы блізка, а не па чутках.

Я адзін толькі прыклад прывяла, а бібліятэчная справа — гэта ж цэлая навука! І гэтай навукай у інстытуце поўнасцю не авалодаеш, тут усё залежыць ад характару бібліятэкара, ад яго добрасумленнасці і, галоўным чынам, ад яго любві да кніг.

Калі я прыняла бібліятэку, яна мясцілася ў старым драўляным доме. Не было дзе павярнуцца. Мы перабраліся ў новы будынак — сапраўдны палац кнігі! Вырашылі назваць бібліятэку імем Надзеждзы Канстанцінаўны Крупскай. Па-старому ўжо ніяк нельга было працаваць.

Галіна Іванаўна змаўкае, задуменна глядзіць на стэлажы, дзе стаяць тысячы кніг, потым гаворыць:

— Значыцца, пра пачатак я вам расказала, а пра астатняе мяркуйце самі. Пагаварыце з нашымі работнікамі, з чытачамі, яны вам усё і раскажуць.

Я праходжу ў вялізную залу хатняга абанемента. «Свабодны доступ да кніг? Добра гэта ці дрэнна?» — думаю я. І, адчуўшы моцнае жаданне тут жа падысці да стэлажа і пакорпацца ў кнігах, упэўнена адказваю сабе: «Вядома, добра!» Назва кнігі, вымаўленая бібліятэкарам, яшчэ ні аб чым табе не гаворыць. А вось патрымаць кнігу ў руках, пагартаць яе старонкі — іншая справа.

Крадком назіраю за чытачамі. Вось адзін з іх узяў кнігу з паліцы і адразу ж паставіў яе на месца. Затое другую ён доўга круціў у руках, перагортваў старонкі, пяшчотна гладзіў вокладку. Я міжволі ўсміхнулася...

Да аднаго з чытачоў (відаць, гэта быў навучэнец тэхнікума) падышла Надзежда Цімафееўна Тузава.

— Вам, здаецца, патрэбен Пісараў, дык вы не там шукаеце. Вось, калі ласка, — яна працягнула чытачу томік. Паміж бібліятэкаркай і чытачом завязалася размова. Яны спрачаліся пра адносіны Пісарава да Пушкіна. Абодва, нягледзячы на некаторае разыходжанне думак, выявілі тонкае разуменне пытання.

— Вазьміце для параўнання Бялінскага, яго том з артыкуламі пра Пушкіна, — прапанавала Надзежда Цімафееўна. — Няўрымслівы Вісарыён, як вы пераканаецеся, быў куды больш аб'ектыўны ў ацэнках вершаў вялікага паэта. Хоць і Пісарава я вельмі люблю за вастрыню думкі, за яго непахіснасць перад аўтарытэтамі. Аднак, — усміхнулася Надзежда Цімафееўна, — і мы з вамі павінны быць крыху крытыкамі, калі чытаем кнігі. Трэба выхоўваць сваю думку на літаратуру, на жыццё...

Надзежда Тузава разам з Елізаветай Шустэрман загадваюць так званым «маладзёжным сталом». Іх у бібліятэцы называюць лоцманамі кніжнага мора. Памагчы маладому чалавеку знайсці правільны шлях — задача ганаровая, вельмі адказная і цяжкая. Знайсці шлях — гэта, магчыма, гучыць не зусім дакладна ў дадзеным выпадку. Больш правільна будзе сказаць: памагчы чытачу адшукаць патрэбную кнігу. А ўжо яна, кніга, памагае чалавеку ступіць на правільны шлях.

Што чытае моладзь і як чытае? — вырашэннем гэтых пытанняў і заняты работнікі «маладзёжнага стала».

Юнак, якому даводзіцца штодзённа па сем гадзін стаяць ля станка, не мае магчымасці чытаць усё, што трапіцца. Ды наўрад ці такое «ўсёяднае» стаўленне да літаратуры можа прынесці каму-небудзь асаблівую карысць. Значыць — юнаку гэтаму трэба параіць самыя патрэбныя, жыццёва неабходныя кнігі. Надзежда Тузава або Елізавета Шустэрман заўсёды памогуць скласці план чытання. Але тут яшчэ кропку ставіць рана. Бо існуе не толькі майстэрства пісаць кнігі, але і **майстэрства чытаць** іх. А гэтай справай з наскоку не авалодаеш. Тут якраз і прыходзяць на дапамогу маладому чытачу бібліятэкары. Часам дапамогі прыходзіцца шукаць і ў загадчыцы даведачнага аддзела. А ў асабліва цяжкіх выпадках — у старэйшага бібліятэкара Аляксандры Ігнатаўны Грознай. Нядаўна бібліятэка адсвяткавала яе пяцідзесяцігадовы юбілей...

Прыйшоў неяк у бібліятэку малады рабочы Віктар Уласенка.

— Вялікае вам дзякуй, — сказаў ён Надзеждзе Цімафееўне. — Вы памаглі мне набыць спецыяльнасць фрэзероўшчыка.

— Завошта ж дзякаваць мне? — здзівілася Надзежда Цімафееўна.

— Як так? А хто мне план чытання складаў, хто падбіраў кнігі па спецыяльнасці? Вы, Надзежда Цімафееўна! У мяне сёння, так сказаць, другі дзень нараджэння, і без вашага ўдзелу гэтае свята не абыдзецца.

Такіх «імянніннікаў» Надзежда Цімафееўна мае шмат сярод чытачоў бібліятэкі.

— Лёгкую музыку я люблю, часта слухаю яе па радыё, — прызналася аднойчы Тузавай швачка камбіната штучнай футры Галіна Пенчукова.— а вось сімфанічную, шчыра кажучы, не разумею. Чайкоўскі, Бетховен — усё гэта для мяне незразумела. Прызнацца, іншы раз нават сорамна бывае...

— Што ж, гэтую справу можна паправіць, — адказала Надзежда Цімафееўна. — Для пачатку прачытайце кнігі пра жыццё і творчасць вялікіх кампазітараў. Важна зразумець, для чаго яны пісалі музыку, як жылі, да чаго імкнуліся...

З дапамогаю бібліятэкаркі Надзежды Тузавай Галіна Пенчукова навучылася чытаць ноты, палюбіла і навучылася разумець сімфанічную музыку. Цяпер яна наведвае музычны факультэт універсітэта культуры.

Шмат можна было б расказаць і пра тое, як працуе бібліятэкарка Вера Ваўчок. Яна кансультуе хатніх гаспадынь, маладых маці, падбірае для іх літаратуру, раіць, кіруе чытаннем.

Але і работнікі бібліятэкі, асабліва маладыя, маюць патрэбу ў кансультацыі. У цяжкіх выпадках на дапамогу ім прыходзіць Аляксандра Ігнатаўна Грозная. Гэта яна робіць, так сказаць, у парадку грамадскай нагрузкі і, вядома, па загаду сэрца. А сэрца ў Аляксандры Ігнатаўны добрае, чулае. Галоўная ж работа ў яе — гэта камплектаванне і апрацоўка кніг. У гэтай справе Аляксандра Ігнатаўна — «прафесар»! Вось яна прыехала з Мінска, стомленая, але задаволеная.

Грошай на набыццё кніг малавата. Таму трэба асабліва старанна выбіраць кнігі. І Аляксандра Ігнатаўна імкнецца прынесці чытачам як мага больш радасці. Яна часта паўтарае словы Максіма Горкага аб тым, што добрая кніга — свята для чытача. Асабліва стараецца яна, калі справа датычыць моладзі. Для гэтага яна ўважліва чытае кнігі, напісаныя літаратарамі малодшага пакалення. На яе стале творы В. Аксёнава, Р. Раждзественскага, Я. Еўтушэнкі, Б. Беднага, А. Вазнясенскага, Р. Барадуліна, Ул. Караткевіча, Н. Гілевіча, С. Гаўрусёва...

Канферэнцыі чытачоў праводзіліся ў Маладзечна і раней. У падрыхтоўцы да іх усё было загадзя распісана. Жывога слова, бывала, не пачуеш на такіх канферэнцыях. Але з таго часу, як у гэтую работу актыўна ўключыліся чытачы, паявілася, як сказаў бы Павел Бажоў, «жывінка ў справе». Вельмі цікава, напрыклад, прайшла канферэнцыя, прысвечаная творчасці Галіны Нікалаевай.

Часта ў бібліятэцы праводзяцца літаратурныя вечары. Напярэдадні Галіна Іванаўна заказвае па тэлефоне Мінск, здымае трубку, звоніць у Саюз пісьменнікаў шэфу бібліятэкі Мікалаю Гаўрылавічу Ткачову:

— Мікалай Гаўрылавіч, прышліце нам пісьменнікаў!

І Мікалай Гаўрылавіч перадае просьбу чытачоў Маладзечна мінскім літаратарам, яны прыязджаюць, чытаюць вершы, дзеляцца сваімі творчымі задумамі. У нас пабывалі ўжо Максім Танк, Міхась Машара, Алесь Бажко, Алесь Асіпенка і многія іншыя пісьменнікі рэспублікі.

Але часцей за ўсё, вядома, арганізатарамі і ўдзельнікамі такіх вечароў з'яўляюцца мясцовыя літаратары, члены творчага аб'яднання пры рэдакцыях міжраённай і гарадской газет. З дакладамі аб беларускай літаратуры выступае наш крытык і літаратуразнаўца М. Ермаловіч.

Амаль кожны дзень у бібліятэцы можна ўбачыць сівога, з разумным інтэлігентным тварам чалавека. Ён любоўна пераплятае зношаныя кнігі, памагае бібліятэкарам падбіраць для чытачоў літаратуру. Гэта старшыня савета бібліятэкі Андрэй Барысавіч Караткевіч. У савет, апроч Андрэя Барысавіча, уваходзяць выкладчык тэхнікума В. Чамярыцкі, М. Ермаловіч і іншыя.

Няўжо ў рабоце Маладзечанскай гарадской бібліятэкі няма недахопаў? — спытае чытач. Ёсць, вядома. Але здараюцца яны, як мне здаецца, галоўным чынам з-за некаторай недасканаласці самой бібліятэчнай справы. Бібліятэкар павінен чытаць, чытаць і чытаць. Гэта яго найпершы абавязак, яго **работа**. А часу на актыўнае, на творчае чытанне ў бібліятэкара не застаецца. Дома амаль у кожнага ёсць свае сямейныя, гаспадарчыя і іншыя справы. На чытанне можна, як і кожнаму чытачу, выкраіць гадзіну-другую. Але гэтага мала, вельмі мала! Вось калі б з сямі адпушчаных бібліятэкару рабочых гадзін дзве гадзіны можна было адвесці такому вось спецыяльнаму чытанню! І пра тое, як зрабіць гэта — а як гэта было б разумна і добра! — варта падумаць таварышам з Міністэрства культуры рэспублікі.

Што можна сказаць аб тым, як правяраюць работу бібліятэк «вышэйстаячыя» арганізацыі? Часцей за ўсё глядзяць на лічбы ў справаздачах. Чытачоў, кнігавыдач, канферэнцый многа — значыць добра. А лічбы могуць іншы раз і ашукаць. Куды больш неабходна праверыць, як самі бібліятэкары ведаюць літаратуру, прапагандыстамі якой належыць ім быць. Трэба сказаць — не ва ўсіх бібліятэкараў яшчэ вялікая любоў да літаратуры, не ўсе яны могуць пахваліцца яе глыбокім і ўсебаковым веданнем. Але гэта, бадай, ужо іншая тэма. І я спадзяюся, што чытачы прадоўжаць размову аб ёй.

Н. АНДРЭЕВА.

г. Маладзечна.

Студэнцкі драматычны гурток у Брэсцкім педагагічным інстытуце быў створаны 15 год назад. За гэты час яго ўдзельнікі падрыхтавалі і паставілі шмат спектакляў, у тым ліку — «Разлом», «Любоў Яравая», «Калі пяюць жаваранкі», «На бойкім месцы» і іншыя. Кіруе гуртком з дня яго стварэння артыст абласнога тэатра Аляксей Максімавіч Самараў.

Нядаўна ў інстытуце адбылася сустрэча студэнтаў з былымі гурткоўцамі.

На здымку: настаўнік школы № 15 горада Брэста Ф. А. Шах, які ўдзельнічаў у пастаноўцы першага спектакля гуртка (у цэнтры), гутарыць са студэнтамі.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

У АПОШНІ ШЛЯХ

9 студзеня ў клубе Саюза пісьменнікаў з самае раніцы быў адкрыты доступ да труны з прахам паэта Андрэя Іванавіча Александровіча. Ля труны, якая патанае ў жывых кветках, мяняецца ганаровая варта. Пісьменнікі і паэты, мастакі, артысты, журналісты, вучоныя, настаўнікі, студэнты, рабочыя і калгаснікі... Прыйшлі сюды развітацца з паэтам-камуністам, грамадскім дзеячом, вучоным, прыйшлі, каб сказаць сваё апошняе і шчырае бывай.

А другой гадзіне дня грамадскую паніхіду адкрывае народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў. Ён гаворыць аб тым, што сёння мы праводзім у апошні шлях нашага таленавітага друга і пісьменніка. Андрэй Александровіч — адзін з ветэранаў беларускай савецкай літаратуры.

Потым са словам пра паэта выступае Пятро Глебка.

— Мы развітваемся, — гаворыць П. Глебка, — з адным са старэйшых прадстаўнікоў нашай літаратуры. Паэт Александровіч належыць да тых пісьменнікаў, якія закладалі асновы беларускай літаратурнай арганізацыі. Яго кнігі «Па беларускім бруку», «Прозалацъ», «Угрунь», паэмы «Цені на сонцы», «Паэма імя вызвалення» і іншыя з'яўляюцца здабыткам нашай літаратуры. Паэт-камсамолец, камуніст з'яўляўся прыкладам паэта-грамадзяніна. Пятро Глебка гаворыць, што Андрэй Александровіч вёў значную работу як член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР.

Ад Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР выступіў навуковы супрацоўнік Кузьма Хромчанка. Потым бярэ слова паэт Мікола Хведаровіч.

Гучыць жалобная музыка. Катафалк з труною павольна плыве па шырокім Ленінскім праспекце Мінска, таго горада, які так шчыра і аддана любіў паэт.

Над магілай паэта на апошнім развітанні выступіў пісьменнік Іван Шамякін. Верш памяці паэта прачытаў Станіслаў Шушкевіч.

Падае зямля на труну паэта, і хутка магільны курганчык патанае ў вянках.

НЕ ЗАБУДУ НІКОЛІ

Вельмі балюча і крыўдна траціць блізкіх і дарагіх сяброў, якім бы трэба было яшчэ жыць і жыць. Таму цяжка прымусіць сябе гаварыць і пісаць пра Андрэя Александровіча ў мінулым часе. У маім уяўленні ён заўсёды жывы, аптымістычны, заклапочаны аб заўтрашнім дні.

Я чытаю і перачытваю яго апошні навагодні ліст. Колькі ў ім усхваляваных разважанняў пра нашу літаратуру, пра маладую паэзію, пра выданне новых кніг, якая прага жыць і працаваць.

Ён збіраўся вярнуцца ў Мінск у канцы студзеня, абяцаў прывезці пераклады украінскай паэзіі і адразу ўзяцца за работу над двухтомнікам выбраных твораў. Цяжка хворы, ён ніколі не апускаў рук, не траціў надзею, не скараўся лёсу. У самыя цяжкія хвіліны ён знаходзіў сілы на дасціпны жарт і на добрае мудрае слова. І смерць не раз адступала перад ім.

Людзі майго пакалення, старэйшыя і маладзейшыя, са школьных чытанак і хрэстаматый дагэтуль помняць дзесяткі вершаў Андрэя Александровіча, успамінаюць яго «Цені на сонцы», «Нараджэнне чалавека», «Па беларускім бруку» і добры дзесятак кніг, напісаных пазней. А колькі іх напісаў бы Андрэй Александровіч за тыя дваццаць гадоў, калі ён дзёўб вечную мерзлату, пілаваў лістоўніцы і піхты? Якое б месца ён сёння займаў у нашай літаратуры, каб з ім не здарылася тое, што мы цяпер сімвалічна называем «трыццаць сёмы год»?

Але і там, адкуль не вярнуліся многія нашы таварышы, Андрэй Александровіч заставаўся камуністам, чалавекам і паэтам. Пра гэта сведчаць яго вершы, напісаныя ў тыя гады і нядаўна апублікаваныя ў «Полымі».

Мне яшчэ не верыцца, што не атрымаю адказ на сваё пісьмо, што больш ніколі не сустрэну Андрэя Іванавіча, не пачую яго глухаваты шчыры голас.

Я зноў перачытваю яго апошні ліст. «Не забывай мяне», — напісаў ён у канцы. Цяпер гэты сказ набывае зусім іншы сэнс.

Не, не забуду ніколі, дарагі Андрэй! Не забудуць цябе твае таварышы і чытачы.

Сяргей ГРАХОЎСКІ.

У нашых сяброў

САВЕЦКАЯ КНІГА У ЧЭХАСЛАВАКІІ

У цэнтры Прагі на Вацлаўскай плошчы ёсць кніжны магазін, які карыстаецца асаблівай увагай і папулярнасцю ў жыхароў чэхаславацкай сталіцы і прыезджых гасцей. Сюды заходзіць кожны, хто цікавіцца навінкамі савецкай палітычнай, навукова-тэхнічнай і мастацкай літаратуры.

Магазін так і называецца «Савецкая кніга». Цяпер тут усё часцей пытаюцца апошняе выданне «Гісторыі КПСС». Увесь час даводзіцца папаўняць паліцы творамі класікаў рускай літаратуры, якія ў Чэхаславакіі карыстаюцца традыцыйнай папулярнасцю і любоўю Часта ў магазіне можна пачуць пытанне: «Ці не паступіў у продаж 4-ы том Ясеніна?», «Ці не закончыў Міхаіл Шолахаў першую кнігу рамана «Яны змагаліся за радзіму»? Студэнцкая моладзь цікавіцца Вінакуравым, Еўтушэнкам і Вазнясенскім.

І кожны тут мае магчымасць ці набыць, ці заказаць патрэбную кнігу, атрымаць неабходную даведку. Інфармацыйны цэнтр магазіна выпускае бюлетэнь «Навінкі савецкай літаратуры» тыражом у 8 тыс. экземпляраў. Яго атрымліваюць бібліятэкі, прадпрыемствы, навуковыя ўстановы і асобныя чытачы.

У Празе такі кніжны магазін не адзін. Вялікія шыльды «Савецкая кніга» сустрэнеш і на Парожыцэ, і на Вінаградскай, у кожным вялікім горадзе рэспублікі. Усяго іх 25.

Гэта, так сказаць, стацыянарныя магазіны. Але іншы раз на дарозе можна сустрэць і вялікі аўтобус з надпісам «Савецкая кніга». Гэта ўжо кніжны магазін на колах. Куды ён накіроўваецца? На завод, да шахцёраў, у сельскагаспадарчы кааператыў ці ў вялікі курортны цэнтр. За тыдзень аўтобусы прадаюць кніг на 15—20 тысяч крон.

Магазіны «Савецкая кніга» падтрымліваюць цесныя сувязі з гурткамі чытачоў савецкай літаратуры. У дні месячнікаў чэхаславацка-савецкай дружбы яны наладжваюць выстаўкі савецкай кнігі. У 1962 годзе было адкрыта 7 тыс. такіх выставак. Усяго ў мінулым годзе з Савецкага Саюза ў Чэхаславакію было прывезена больш 20 тыс. назваў кніг.

Чэхаславацкая грамадскасць праяўляе вялікую цікавасць да савецкага перыядычнага друку. Падпіска на савецкія газеты і часопісы дасягнула тут рэкорднай лічбы — 510 тыс. экземпляраў. Цяпер Чэхаславакія атрымлівае з Савецкага Саюза 1.200 назваў газет і часопісаў.

З кожным годам павялічваецца лічба назваў і тыраж савецкіх кніг, якія выпускаюцца ў перакладзе на чэшскую і славацкую мовы. Толькі адно выдавецтва «Свет Советов» выдала за апошнія 5 год звыш 2 млн. тамоў кніг класікаў рускай літаратуры і савецкіх аўтараў.

Самымі актыўнымі чытачамі савецкіх кніг, газет і часопісаў з'яўляюцца слухачы курсаў рускай мовы. Увосень 1962 года больш 100 тыс. чэхаславацкіх грамадзян, якія аб'яднаны ў 8 тыс. гурткоў, пачалі вывучаць рускую мову. За апошнія 5 год курсы рускай мовы ў Чэхаславакіі скончыла каля 800 тысяч чалавек.

ПРАЗ ТРЫ ГАДЫ...

Берлінскі клуб імя Эрыха Вайнерта стаў месцам «агляду» самадзейнага тэатральнага мастацтва на прадпрыемствах рэспублікі. Прадстаўнікі рабочых тэатраў з усіх акруг рэспублікі расказалі аб сваіх творчых дасягненнях, абмяняліся вопытам.

Тры гады прайшло з таго часу, як лепшым калектывам на заводах і фабрыках, у сельскагаспадарчых, вытворчых кааператывах і ў народных маёнтках было прысуджана ганаровае званне «Рабочы тэатр». Тады такіх тэатраў былі адзінкі. А зараз ужо ў рэспубліцы налічваецца 123 рабочыя тэатры (у тым ліку 16 у вёсках). У іх удзельнічаюць каля 4 тысяч працоўных. Кіруюць гэтымі самадзейнымі тэатральнымі калектывамі 329 прафесіянальных работнікаў тэатра. За адзін месяц на выступленнях 123 рабочых тэатраў пабывала 673 тысячы гледачоў.

ЗНАХОДКІ У ВЕЙМАРЫ

Разбіраючы архіўныя матэрыялы Цюрынгскай зямельнай бібліятэкі ў Веймары, прафесар Г. Херц знайшоў арыгіналы двух пісем, якія напісаны вядомым дзеячом нямецкага рабочага руху Вільгельмам Лібкнехтам.

Праз некалькі дзён у гэтым жа кнігасховішчы быў знойдзен невядомы арыгінал пісьма другога віднага дзеяча германскай сацыял-дэмакратыі Аўгуста Бебеля, якое датавана 1900 годам.

ТРОХМІЛЬЁННЫ НАВЕДВАЛЬНІК

На ўвесь свет славіцца сваімі скарбамі Дрэздэнская карцінная галерэя. Тут можна ўбачыць неўміручыя шэдэўры Рафаэля, Мікеланджэла, Тыцыяна, Рэмбранта і многіх іншых вялікіх майстроў кісці. Савецкая Армія выратавала ў 1945 годзе гэтыя творы ад знішчэння. Яны былі перавезены ў Савецкі Саюз для захавання і рэстаўрацыі. У 1958 годзе карціны вярнуліся «дадому» — у нанава адбудаваную карцінную галерэю Цвінгера (так называецца цэлы архітэктурны ансамбль, адно крыло якога займае выстаўка).

З усіх канцоў рэспублікі, а таксама з-за рубяжа прыязджаюць у Дрэздэн аматары жывапісу, каб палюбавацца на гэтыя карціны. 22 снежня дырэкцыя галерэі ўрачыста ўшанавала трохмільённага наведвальніка адроджанай карціннай галерэі. Ім аказаўся савецкі салдат з групы савецкіх войск, у час знаходжання на тэрыторыі ГДР, Віктар Мікалаевіч Сцеван з Кіева.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

АТ 05116

Друкарня выдавецтва «Звязда».

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.